Адкуль паходзіць Змей Гарыныч?

СТАР. 3

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Чэмпіёны ўжо вяртаюцца дадому

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 114 (27724) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Фота БЕЛТА.

СОЛЬ ЗЯМЛІ

Буйныя сусветныя кампаніі праяўляюць інтарэс да супрацоўніцтва з нашай краінай у калійнай сферы

Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка здзейсніў рабочую паездку на ААТ «Беларуськалій». Кіраўніку дзяржавы далажылі аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства, сённяшнім становішчы на сусветным рынку калійных угнаенняў, перспектывах развіцця, паведамляе БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з тэхналагічнай схемай работы Чырвонаслабодскага рудніка, паназіраў за тым, як арганізавана работа. Прэзідэнту таксама было даложана аб рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у ААТ «Беларуськалій». У прыватнасці, у верасні гэтага года запланаваны ўвод у эксплуатацыю хімічнага камбіната па глыбокай комплекснай перапрацоўцы хларазмяшчальнай мінеральнай сыравіны. Акрамя таго, вядзецца будаўніцтва Петрыкаўскага горна-абагачальнага комплексу. Тут ужо праведзена даразведка радовішча, выкананы праектныя і праектна-пошукавыя работы падрыхтоўчай стадыі, рэканструкцыя меліярацыйнай сістэмы, зроблены кантрольна-ствалавыя свідравіны пад шахтавыя ствалы, падведзены аўтадарогі, а таксама будуць пабудаваны два 59-кватэрныя жылыя дамы для работнікаў. Плануецца, што магутнасць комплексу складзе не менш за 1,5 млн т хлорыстага калію ў год.

ЗАТ «Беларуская калійная кампанія» ў 2014 годзе адзначае рэкордныя аб'ёмы вытворчасці і экспарту калійных угнаенняў, далажыла Прэзідэнту гендырэктар БКК Алена Кудравец. Сёлета прададзена больш за 4 млн т калійных угнаенняў, ёсць кантракты на ліпень і фарміруецца праграма на жнівень. Беларускі бок вельмі шчыльна працуе па пастаўках калійных угнаенняў у Бразілію, Кітай, Паўднёва-Усходнюю Азію, развівае еўрапейскі напрамак і пастаўкі ў Афрыку як вельмі перспектыўны рэгіён у будучыні.

Акуратна рэагаваць на існуючыя на рынку тэндэнцыі — такую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў перад калійшчыкамі. «Я так разумею, нашы канкурэнты ў свеце захвалявaліся, яны ўжо нам прапануюць да іх у абдымкі. Ні ў якім выпадку мы ў тактыцы не павінны прайграць. Калі яны нам прайграюць, няхай прыйдуць і скажуць: «Мы прайгралі». І з гэтага будзем зыходзіць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Усё павінна быць у нашых інтарэсах. Але — ніякіх асабістых амбіцый. Усё павінна быць акуратна, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Не трэба завальваць рынак танным каліем, таму што гэта нашы страты. Трэба вельмі тонка, акуратна рэагаваць на тэндэнцыі, якія ёсць на рынку.

Гутарачы з працоўным калектывам ААТ «Беларуськалій», Прэзідэнт закрануў надзённыя пытанні ў жыцці грамадства.

«Ніхто не ў стане перавярнуць краіну, за выключэннем толькі адной прычыны — эканамічнай. Нашу стабільнасць можа разбурыць толькі эканоміка, калі ў нас не будуць працаваць прадпрыемствы, калі мы не будзем прадаваць выраблены прадукт», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што прадукцыю трэба выпускаць якасную і па нармальнай цане.

Кіраўнік дзяржавы расказаў таксама аб магчымасці сур'ёзнай ратацыі кадраў у краіне — ад урада да кіраўніцтва буйных прадпрыемстваў, «калі не будзе належнага выніку». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адпаведнае пытанне нядаўна разглядалася на пасяджэнні Савета бяспекі. «Я шчыра ім сказаў, каб не было крыўды: не будзе выніку — мы з вамі будзем расставацца», — падкрэсліў беларускі лідар. «У вельмі складаных умовах «Беларуськалій» паказаў, як трэба працаваць на міжнародных рынках. Чаму не можа БелАЗ, МТЗ, МАЗ? Могуць! Напэўна, няма жадання ці ўжо выпрацаваліся», — дадаў ён.

Прэзідэнт адзначыў вялікую цікавасць буйных сусветных кампаній да супрацоўніцтва з Беларуссю ў калійнай сферы. Цана на калійную прадукцыю стабілізавалася на пэўным узроўні і нават паступова пачынае ўзрастаць.

СТАР. 2

СПРАВА НА МІЛЬЯРДЫ

Першая вытворчасць у Кітайска-беларускім індустрыяльным парку з'явіцца ў наступным годзе

У Смалявіцкім раёне ўчора адбылася цырымонія закладкі першага каменя Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка. Важны міждзяржаўны праект, да якога прыцягнута пільная ўвага многіх, пераходзіць у актыўную стадыю рэалізацыі.

Фота БЕЛТА.

Упершыню аб неабходнасці стварэння індустрыяльнай пляцоўкі для ўвасаблення новых ідэй было заяўлена ў сакавіку 2010 года падчас візіту ў Беларусь тагачаснага намесніка Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна — цяперашняга кіраўніка Кітая. Ідэі, выказаныя першымі асобамі Беларусі і Кітая, знайшлі працяг у міжурадавым пагадненні, падпісаным у Мінску ў верасні 2011 года. Указам Прэзідэнта Беларусі № 253, які рэгулюе прававыя асновы дзейнасці ў індустрыяльным парку, інвестарам гарантаваны абарона правоў і інтарэсаў разам з прывабнымі ўмовамі гаспадарання: вызваленне ад шэрагу падаткаў і значныя льготы пры вытворчасці.

Першым аб'ектам на тэрыторыі, выдзеленай пад індустрыяльны парк, стане камерцыйны і дзелавы цэнтр, у якім змогуць размясціцца выставачныя залы і дэманстрацыйныя офісы першых рэзідэнтаў і кіруючай кампаніі. Рэзідэнтам будуць прапанаваны ўчасткі для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў з гатовай інфраструктурай (сеткі электра-, вода- і газазабеспячэння, водаадвядзення, дарогі). На другім этапе плануецца будаўніцтва тыпавых вытворчых памяшканняў для здачы ў арэнду або продажу, адміністрацыйных карпусоў, жылля.

На цырымонію закладкі першага каменя прыехалі больш за пяцьдзясят кіраўнікоў розных арганізацый. Сярод іх топ-менеджары вядучых кітайскіх карпарацый, уласнікі і кіраўнікі кампаній, якія працуюць у сферах авія- і машынабудавання, вытворчасці электронікі, рознічнага гандлю. Сумарны капітал найбуйнейшых кампаній, прадстаўнікі якіх удзельнічалі ў цырымоніі, складае сотні мільярдаў долараў.

Вялікая дэлегацыя ўрадавых і дзелавых колаў горада Харбін таксама прыняла ўдзел у цырымоніі. Адзначу, уладамі Харбіна ўжо прынята рашэнне аб будаўніцтве Харбінскага субпарка ў складзе індустрыяльнага парка, а муніцыпальная карпарацыя «Харбінская інвестыцыйная група» ўнесла першыя інвестыцыі ў праект.

СТАР. 2

ЛІЧБА ДНЯ

Br117,6 трлн

склаў рознічны тавараабарот у студзені—маі гэтага года. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ён вырас на 11,9%. Доля продажу харчовых тавараў у рознічным тавараабароце склала 49,4%, нехарчовых — 50,6%. У бягучым перыядзе насельніцтву прададзена харчовых тавараў на Br58,1 трлн, нехарчовых тавараў — на Br59,5 трлн, што складае адпаведна 108,1% і 115,6% да ўзроўню адпаведнага перыяду мінулага года.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.06.2014 г.

Долар ЗША	10170,00	■
Еўра	13850,00	▲
Рас. руб.	296,50	▲
Укр. грыўня	851,40	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+19°
Віцебск	+19°
Гомель	+23°
Гродна	+18°
Магілёў	+22°
Мінск	+19°

ЛЕТА ПАКУЛЬ НЕ ГРЭЕ

У пятніцу тэрыторыя нашай краіны зноў трапіць пад уплыў даволі свежага паветра, якое рухаецца да нас з боку Заходняй Еўропы, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму сёння паўсюдна будуць ісці кароткачасовыя дажджы, месцамі — навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад плюс 16 градусаў па паўночным захадзе, да 24 цяпла — па паўднёвым усходзе краіны. Холад будзе гаспадарыць у нас і ў выхадныя. У гэтыя два дні месцамі, а ўдзень у нядзелю ўжо паўсюдна чакаюцца непрацяглыя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ў ноч на суботу будзе на ўзроўні плюс 6-12 градусаў, а ўдзень — 14-21 цяпла. У ноч на нядзелю стане ўвогуле халадна — толькі 4-11 цяпла, удзень — плюс 13-20, і толькі па паўднёвым усходзе прыгрэе да плюс 23 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў, даволі халадна будзе і ў першыя тры дні наступнага тыдня. Часам будуць ісці кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Уначы прагназуецца ад 5 да 13 цяпла, а ўдзень максімум плюс 13-20 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Абітурыент-2014

Па прафесію марожаншчыка — у Слуцкі дзяржаўны каледж

Ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі нашай краіны стартавала прыёмная кампанія, таму ў прыёмных камісіях ужо чакаюць абітурыентаў. Дакументы прымаюцца па 20 жніўня, але набор можа быць падоўжаны, калі застануцца незапоўненыя месцы.

Сёлета 195 установаў прафтэхадукацыі будуць весці набор амаль па 300 прафесіях. Акрамя таго, прыём для навучання па рабочых прафесіях ажыццяўляюць і 23 установы адукацыі іншых узроўняў, дзе таксама рэалізуюцца адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Так, у гэтым годзе адкрыта падрыхтоўка па запатрабаваных рабочых прафесіях у 2 установах сярэдняй спецыяльнай адукацыі, падпарадкаваных канцэрну «Беллегпрам»: размова ідзе аб прафесіі швачкі, памочніка майстра, слесара-рамонтніка, тэрмаапрацоўшчыка швейных вырабаў, абцяжчыка і зборшчыка абутку. А ў Мінскім аўтамеханічным каледжы пачнуць рыхтаваць слесараў па рамонце аўтамабіляў.

Па звестках Міністэрства адукацыі, сёлета ва ўстановы прафтэхадукацыі плануецца прыняць 36,6 тысячы чалавек, што на 2 тысячы чалавек больш, чым летась. Пры гэтым на дзённую форму плануецца залічыць 33,7 тысячы чалавек, у тым ліку 19,5 тысячы — на аснове агульнай базавай адукацыі, 13,3 тысячы — на аснове агульнай сярэдняй адукацыі і 800 чалавек — на аснове спецыяльнай адукацыі.

Акрамя таго, прадугледжаны прыём 1,1 тысячы чалавек на завочную і 1,8 тысячы — на вячэрнюю форму атрымання адукацыі. У параўнанні з папярэднім годам будзе павялічаны набор па профілях «Архітэктура і будаўніцтва» (на 19%), «Сельская і лясная гаспадарка. Садова-паркавае будаўніцтва» (на 13,3%), «Грамадскае харчаванне. Бытавое абслугоўванне» (на 8,6%). У структуры прыёму захоўваюцца тэндэнцыі мінулага года: спецыяльнасці рэальнага сектара эканомікі складаюць больш як 80%.

Для таго, каб прывесці структуру падрыхтоўкі кадраў у адпаведнасць з патрэбамі рынку працы ў рэгіёнах, сёлета быў спынены набор па 150 незапатрабаваных прафесіях і адкрыта падрыхтоўка па 163 новых для асобных устаноў прафтэхадукацыі прафесіях. Дарэчы, па адной з іх (вытворца марожанага) падрыхтоўка распачнецца ўпершыню, а рыхтаваць спецыялістаў для вытворчасці марожанага будуць у Слуцкім дзяржаўным каледжы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Памяць

1944-2014 70 гадоў вызвалення

КАБ ГІСТОРЫЮ НЕ ЗНЕВАЖАЛІ

Заўтра ў гонар аперацыі «Баграціён» у Светлагорскім раёне адкрыецца памятны знак

Стратэгічная аперацыя «Баграціён» 70 гадоў таму паклала пачатак вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ідэю стварэння ў яе гонар памятнага знака ля вёскі Раковічы падтрымалі на ўзроўні кіраўніцтва Саюзнай дзяржавы, а таксама Міністэрствы культуры і абароны Рэспублікі Беларусь. Шмат сіл да таго, каб уславіць подзвіг герояў Вялікай Айчыннай, што прымалі ўдзел у адной з самых буйнамаштабных бітваў мінулага стагоддзя, прыклаў паэт Ізяслаў Катляроў.

Праект памятнага знака ў гонар аперацыі «Баграціён».

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ФІНЛЯНДЫЯ МОЖА ПРАВЕСЦІ РЭФЕРЭНДУМ ПА ЎСТУПЛЕННІ Ў НАТА

Фінляндыя павінна сур'ёзна разгледзець пытанне аб уваходжанні ў НАТА з-за агрэсіўных дзеянняў Расіі ў дачыненні да Украіны, заявіў у інтэрв'ю агенцтву Reuters міністр абароны краіны Карл Хаглунд. Ён прапанаваў правесці рэферэндум на гэтую тэму пасля парламенцкіх выбараў 2015 года. Між тым сацыялагічныя апытанні паказваюць, што толькі пятая частка фінаў выступае на карысць далучэння краіны да Паўночнаатлантычнага альянсу. На думку Хаглунда, у сувязі з апошнімі падзеямі ва Украіне грамадская думка можа змяніцца, калі правесці сумленную і адкрытую дыскусію на гэтую тэму.

ДЭПУТАТ ПРАПАНУЕ ЗАБАРАНІЦЬ У МЫТНЫМ САЮЗЕ КЕДЫ, БАЛЕТКІ І ТУФЛІ НА ШПІЛЬКАХ

Дэпутат Дзярждумы Расіі ад «Справядлівай Расіі» Алег Міхееў накіраваў кіраўніку Еўразійскай эканамічнай камісіі Віктару Хрысценку ліст, у якім назваў кеды, балеткі, туфлі на шпільках, а таксама мужчынскія туфлі-лоўферы і макасіны небяспечнымі для здароўя. Міхееў просіць уключыць у тэхнічны рэгламент Мытнага саюза новыя патрабаванні да абутку. На яго думку, патрабаванні да прадукцыі не павінны абмяжоўвацца толькі трываласцю і воданепранікальнасцю, як цяпер. У лісце адзначаецца, што, паводле статыстыкі, каля 40% дарослага насельніцтва пакутуе на плоскаступнёвасць. Шмат у чым з-за гэтага ў 2014 годзе адбыўся першы прызыў юнакоў ва ЎС Расіі з плоскаступнёвасцю, бо без гэтага захворвання знайсці прызыўніка, па словах дэпутата, практычна немагчыма.

АБХВАТ ТАЛІІ ПРАДКАЗВАЕ ПРАЦЯГЛАСЦЬ ЖЫЦЦЯ

Калі ў чалавека ў цэлым нармальная вага, згодна з індэксам масы цела, але вялікі аб'ём таліі, то яго ўсё роўна чакае змяншэнне працягласці жыцця. Па словах спецыялістаў з Клінікі Майо, гэтыя высновы яны зрабілі, праналізаваўшы даныя 11 розных даследаванняў больш як 600000 чалавек. Так, у мужчын з абхватам таліі мінімум 100 сантыметраў смяротнасць была павышана на 50% у параўнанні з мужчынамі, якія мелі ў таліі менш за 89 сантыметраў. Пасля 40 гадоў гэта было эквівалентна скарачэнню працягласці жыцця прыкладна на тры гады. У жанчын з абхватам таліі 89 сантыметраў і больш рызыка ранняй смерці павышалася прыкладна на 80% у параўнанні з жанчынамі, што мелі абхват таліі 68,6 сантыметра і менш. Гэта адбірала каля 5 гадоў жыцця.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ПРЫНЦ ФЕЛІПЭ АФІЦЫЙНА СТАЎ КАРАЛЁМ ІСПАНІІ

Прынц Феліпэ, як і чакалася, афіцыйна стаў каралём Іспаніі Філіпам VI. Цырымонія яго ўступлення на трон прайшла ўчора раніцай на сумесным пасяджэнні ніжняй і верхняй палат парламента. Філіп VI прынёс прысягу на канстытуцыі краіны, а затым у прамове намеціў асноўныя напрамкі сваёй дзейнасці ў якасці кіраўніка дзяржавы. Сёння мала хто ў Іспаніі сумняваецца ў тым, што 46-гадовы Феліпэ здольны годна замяніць свайго бацьку Хуана Карласа I. Прынц атрымаў добрую адукацыю ў Іспаніі, Канадзе і ЗША, а таксама прайшоў ваенную падрыхтоўку ва ўсіх родах войскаў.

КАРАТКА

Недзяржаўным сектарам эканомікі за пяць месяцаў 2014 года забяспечана 73,8 працэнта паступленняў у кансалідаваны бюджэт Мінска.

Прадпрыемствы бытавога абслугоўвання насельніцтва Мінска прадаставяць ільготы ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны з 30 чэрвеня па 7 ліпеня. Некаторыя цырульні, майстэрні па рамонце абутку і швейных вырабаў у гэты перыяд абслужаць ветэранаў бясплатна, іншыя — за паўцаны. За паўцаны прадаставяць паслугі і іншыя прадпрыемствы.

Агульная працягласць парадняга разліку тэхнікі, якая прыме ўдзел у парадзе ў азнаменаванне Дня Незалежнасці і 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, што пройдзе 3 ліпеня ў Мінску, складзе больш як 1500 м.

Адвакаты правядуць бясплатныя кансультацыі для маламаёмных па ўсёй краіне 26 чэрвеня з нагоды дня ўтварэння адвакатуры Беларусі.

У Беларусі створаны рэспубліканскі арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў у сувязі з 1000-годдзем спачыну святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

Марына ЛЯВОШКА, шматдзетная маці:

«У ГАЗЕЦЕ ЗАХАВАЎСЯ «ПРЫСМАК» МАЙГО ДЗЯЦІНСТВА»

— «Звязду» памятаю са школьных гадоў. Газета для мяне і цяпер застаецца роднай, з «прысмакам» дзяцінства. І ў першую чаргу таму, што артыкулы ў ёй друкуюцца на якаснай беларускай мове. Сёння, на жаль, ужо не засталося іншых падобных выданняў.

Як штодзённая газета, «Звязда» асвятляе ўсе бакі сучаснага жыцця: палітыку, эканоміку, грамадства, культуру, здароўе. Ва ўсіх гэтых рубрыках ёсць свежыя навіны, аналітыка, і гэта цікава не толькі мне, але і майму мужу, які працуе ў будаўнічым бізнесе.

Добрая адметнасць газеты — шырокі выбар дадаткаў. Тут для сябе абавязкова што-небудзь знойдуць спартсмены, ваенныя, палітыкі, моладзь, дзеячы культуры ды ўвогуле любы чалавек.

Напрыклад, мая маці любіць дадаткі «Краіна здароўя» і «Ігуменскі тракт».

А мне самой больш падабаецца «Сямейная газета». Гэта сапраўдны дапаможнік для маладых сем'яў. Ёсць артыкулы, якія прымушаюць задумацца і расставіць жыццёвыя прыярытэты.

Яшчэ падабаецца старонка «Жырандоля», якая прысвечана культуры. Заўсёды з задавальненнем чытаю інтэрв'ю з беларускімі мастакамі, рэжысёрамі, пісьменнікамі. Навіны культуры, агляд тэатральных прэм'ер і кінапрэм'ер, рэпартажы з фестываляў — аб гэтым так змястоўна пішуць толькі тут.

Я выбіраю «Звязду» і спадзяюся, што яна не зменіць сваёй традыцыйнай адметнасці — радаваць чытачоў якаснымі артыкуламі, якія напісаны прыгожай беларускай мовай.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

СОЛЬ ЗЯМЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт выказаў перакананне, што любая дзяржава — спажывец калійнай прадукцыі (няхай гэта будзе Індыя, Кітай, Бразілія і іншыя) — у першую чаргу аддасць перавагу супрацоўніцтву з дзяржаўнымі кампаніямі, бо ў гэтым выпадку існуюць пэўныя гарантыі. Што датычыцца сітуацыі на калійным рынку, Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што і раней, і ў нядаўнім канфлікце спатрэбілася шмат працы і барацьбы, каб адстаяць як дзяржаўныя інтарэсы, так і канкрэтнае прадпрыемства.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што яго першая сустрэча з работнікамі «Беларуськалія» адбылася яшчэ 20 гадоў таму ў цяжкія часы. «Я тады вам паабяцаў, што калі стану Прэзідэнтам, то ніколі інтарэсы шахцёраў не аддам, і што ваша прадпрыемства, як і многія іншыя, будзе працаваць у інтарэсах краіны, і мы яго будзем заўсёды падтрымліваць. Думаю, праз 20 гадоў вам мяне няма ў чым папракнуць. Мы робім усё для таго, каб было сумленна і прыстойна і на знешніх рынках, і на ўнутраных», — падкрэсліў беларускі лідар.

У час наведвання прадпрыемства Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў губернатара Мінскай вобласці Сямёна Шапіры вынікамі вяснова-палявых работ, а таксама развіццём Салігорска. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пры будаўніцтве ў горадзе жылля ні ў якім выпадку не павінны быць задзейнічаны ўрадлівыя worныя землі, развіццё Салігорска павінна ажыццяўляцца па шляху стварэння спадарожнікаў, забудовы суседніх пасёлкаў.

■ Дзяржаўны інтарэс

ПРАКЛАДВАЦЬ НОВЫЯ МАРШРУТЫ

Фота БЕЛТА.

Беларускім прадпрыемствам неабходна пашыраць геаграфію экспарту, заявіў Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатоль РУБІНАЎ на сустрэчы з працоўным калектывам ААТ «Шклозавод «Нёман», паведамляе БЕЛТА.

«Неабходна не толькі выпусціць, але і прадаць прадукцыю. Канкурэнцыя вельмі вялікая, наш рынак адкрыты, і на ім прысутнічаюць тавары для ўсяго свету. Цяпер у многіх краін ёсць праблема, дзе знайсці рынак і як прадаць. Трэба нацэльвацца не толькі на звыклыя рынкі збыту, але і дадаткова вывучаць краіны, дзе той ці іншы тавар карыстаецца попытам і ёсць пакупніцкая здольнасць», — адзначыў Анатоль Рубінаў. На яго думку, перспектыўнымі рынкамі збыту маглі б стаць краіны Паўднёвага Усходу.

Старшыня Савета Рэспублікі пацікавіўся, ці ёсць у працы прадпрыемства цяжкасці, звязаныя з правіламі, якія прапісаны ў заканадаўстве. «Важна, каб з пункту гледжання заканадаўства не было ніякіх перашкод. Далей справа ініцыятывы. Калі ёсць нейкія абмежаванні, іх трэба выяўляць. Усе праблемныя пытанні мы будзем вырашаць. Менавіта для гэтага мы і выязджаем», — дадаў ён.

Анатоль Рубінаў звярнуў увагу на тое, што сустрэчы з калектывамі прадпрыемстваў дазваляюць пазначыць праблемы, якія патрабуюць вырашэння. «Мы рэгулярна наведваем рэгіёны і розныя прадпрыемствы, каб паглядзець, чым жывуць раёны, як працуюць заводы, як развіваецца эканоміка, ці ёсць нейкія праблемы на месцах», — сказаў ён.

Старшыня Савета Рэспублікі азнаёміўся з работай ААТ «Шклозавод «Нёман». Пасля гутаркі з працоўным калектывам прадпрыемства Анатоль Рубінаў сустрэўся з актывам Лідскага раёна.

АЭРАКЛУБУ — 80! ПАЛЁТ НАРМАЛЬНЫ!

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў шчырыя віншаванні ветэранам, супрацоўнікам і спартсменам Цэнтральнага аэраклуба ДТСААФ імя двойчы Героя Савецкага Саюза С.І. Грыцаўца са знамянальнай падзеяй — 80-годдзем з дня ўтварэння арганізацыі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны 15 яго выпускнікоў, ваенных лётчыкаў, былі ўдастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза. Многія выхаванцы аэраклуба вызначыліся пры выкананні інтэрнацыянальнага доўгу ў мірны час. Яго спартсмены неаднаразова станавіліся абсалютнымі чэмпіёнамі па вышэйшым пілатажы на самалётах, па верталётным і парашутным спорце.

«Сёння аэраклуб па праве з'яўляецца вядучым цэнтрам падрыхтоўкі лётчыкаў-спартсменаў і парашутыстаў, будучых ваенных лётчыкаў, адыгрывае важную ролю ў развіцці авіяцыйных відаў спорту і папулярызацыі авіяцыі», — гаворыцца, у прыватнасці, у віншаванні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШЛЯХАМ ПАМЯЦІ

Магілёў перадаў марафону памяці «70!» зямлю з Буйніцкага поля, палітую крывёю абаронцаў

Горад на Дняпры стаў чацвёртым на шляху рэспубліканскага маладзёжнага марафону «70!», прысвечанага 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На Савецкай плошчы, куды прыбыў перасовачны музей-бус,

адбыўся ўрачысты мітынг і былі ўскладзены кветкі. Валанцёры арганізавалі флэшмоб і стварылі жывы калідор, па якім прайшлі ветэраны. Падлеткі трымалі ў руках партрэты тых, хто набліжаў Дзень Перамогі.

— Магілёўская вобласць панесла вялікія страты ў Вялікай Айчыннай вайне, — адзначыў **старшыня абласной ветэранскай арганізацыі Анатоль ЛЮБЧАНКА.** — Яна дала Радзіме 114 Герояў Савецкага Саюза. Нельга забыць мужнасць людзей, якія 23 дні і ночы стрымлівалі пад Магілёвам шалёны націск ворага. Мы выжылі, каб данесці да моладзі тую жахлівую праўду вайны.

Пасля мітынгу ветэраны першымі змаглі агледзець экспанаты перасовачнага музея. Мінамёт 82-га калібру, вінтоўкі Мосіна, кулямёт Дзегцярова, амуніцыя тых часоў — усе гэтыя рэчы, якія прадстаўлены гісторыка-культурным комплексам «Лінія Сталіна», сапраўдныя. Нават сярэбраная шашка маршала І.Х. Баграмяна, з якой можна было сфатаграфавацца ўсім ахвотным. З цікавасцю гарталі наведвальнікі музея кнігу Выдавецкага дома «Звязда» — «Партызанская зброя», якая таксама была прэзентавана для выстаўкі. Наведаць музей-бус можна было і на плошчы Зорак, куды ён потым перамясціўся перад тым, як адправіцца далей, у культурную сталіцу краіны — Гродна.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.

СПРАВА НА МІЛЬЯРДЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Да пачатку цырымоніі закладкі першага каменя адбылася прэзентацыя індустрыяльнага парка і інвестыцыйных магчымасцяў Беларусі ў мінскай гасцініцы «Пекін», дзе выступіў міністр эканомікі Мікалай Снапкоў. А пасля яе падпісана пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і Кітайскай нацыянальнай карпарацыяй машынабудавання Sinomach аб стратэгічным партнёрстве.

Непасрэдна на цырымоніі закладкі першага каменя выступілі прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мясніковіч, віцэ-прэм'ер Анатоль Тозік, акцыянеры індустрыяльнага парка, кампаніі, зацікаўленыя ў рэгістрацыі ў якасці рэзідэнтаў парка.

— Мы даём старт самаму буйному практычнаму праекту, які Беларусь рэалізуе з кітайскімі партнёрамі, — адзначыў кіраўнік урада. — У ім атрымаюць развіццё самыя перадавыя кірункі навукі і прамысловасці, высокаінтэлектуальныя вытворчасці створаць канкурэнтаздольную на сусветным рынку новую прадукцыю. Тут будуць генерыраваць самыя перадавыя веды, і тысячы нашых грамадзян змогуць набыць прафесійныя навыкі на аб'ектах парка. У парку будуць таксама створаны камфортныя ўмовы для работы. Аб'ём інвестыцый у праекты з удзелам кітайскага боку ацэньваецца ў 15 млрд доларaў, а карпарацыі Sinomach — у 1,7 млрд.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

■ Процідзеянне

ІНТЭРПАЛ АТАКУЕ КАНТРАФАКТНЫЯ ЦЫГАРЭТЫ

1-я канферэнцыя Інтэрпала па процідзеянні незаконнаму абароту тытунёвай прадукцыі, якая адбылася ў Мінску, пачала маштабную інфармацыйную кампанію па наступствах набыцця таннай кантрафактнай прадукцыі.

Паводле слоў намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Аляксандра ЕЎСЮКОВА, нелегальны цыгарэтны бізнес спрыяе фарміраванню злачынных груповак, якія атрымліваюць звышпрыбытак з наступнай легалізацыяй злачынных даходаў. Дзяржава такім чынам нясе немалыя страты.

Летась супрацоўнікі міліцыі разам з падатковымі і мытнымі органамі выявілі 195 фактаў правапарушэнняў, звязаных з незаконным абаротам цыгарэт, канфіскавана каля 60 млн штук цыгарэт на 17 млрд рублёў. За 5 месяцаў гэтага года выяўлена 88 падобных правапарушэнняў, канфіскавана 22 млн цыгарэт.

Практыка сведчыць, што нелегальным тытунёвым бізнесам займаюцца не дробныя «чаўнакі», а арганізаваныя злачынныя групы. Так, сярэдні аб'ём затрыманых партый склаў летась 15 тыс. пачкаў (а гадамі раней размова ішла пра 1 тысячу). Нелегальны аб'ём ўжывання і транзіту праз Рэспубліку Польшча з краін Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі, ацэньваецца ў амаль 7 млрд штук цыгарэт у год.

— Звышпрыбыткі, якія міжнародныя злачынныя групы атрымліваюць ад рэалізацыі кантрафактнай прадукцыі, ідуць на фінансаванне іншых злачынстваў — незаконны абарот наркотыкаў, зброі, гандлю людзьмі і г.д., — сказаў на канферэнцыі начальнік субдырэктарата Генеральнага сакратарыята Інтэрпала Майкл ЭЛІС. — Гэтую праблему можна вырашыць толькі сумеснымі намаганнямі, абменьваючыся інфармацыяй і вопытам.

Аднак ёсць і іншы бок справы — попыт. Вось чаму і праводзіцца кампанія «Павярнуць злачынства назад». Яе падтрымалі ўжо кіраўнікі ўрадаў многіх краін, вядомыя спартсмены і кінаакцёры, а таксама карыстальнікі сацыяльных сетак, паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.

Святлана БАРЫСЕНКА.

КАБ ГІСТОРЫЮ НЕ ЗНЕВАЖАЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Гэтая ідэя была сапраўды ў паветры сярод тых людзей, з якімі я меў стасункі. Справа ў тым, што Беларусь у вайне мы звычайна бачым ахвярай, якая заплаціла надзвычай вялікі кошт за Перамогу. Усе нашы вёскі і гарады ў помніках, што ўсхваляюць палеглых, а вось помнікаў пераможцам, помнікаў Перамозе, пагадзіцеся, у нас вельмі мала. Гэты мемарыяльны знак — унікальны напамін пра аперацыю «Багратыён», якая стала класічным прыкладам палкаводчай і воінскай мудрасці. У думках я заўсёды параўноўваю яе з пераходам Суворава праз Альпы. Калі перамога была дасягнута не ахвярамі, а інжынернай думкай, стратэгіяй, нечаканасцю. Пры яе правядзенні не толькі мужнасць, але і розум перамагаў. Выбар месца для помніка невыпадковы. Менавіта тут 24 чэрвеня 1944 года савецкія войскі пад кіраўніцтвам генерала Паўла Батава здзейснілі прарыў у варожы тыл — праз вялізнае балота пад назвай Брыдскі Мох. Дзякуючы знаходлівасці і старанням вайскоўцаў былі збудаваны гаці, па якіх цяжкая тэхніка змагла пераадолець дрыгву і зрабіць нечаканы ўдар па войсках ворага. Падрыхтоўка доўжылася некалькі месяцаў, а завяршальны этап — збіванне скобамі для змацавання гацяў — праходзіў пад кананаду артылерыйскай падрыхтоўкі. За ноч на 24 чэрвеня ў першай палове дня стварыліся спрыяльныя ўмовы для ўводу ў прарыў праз балота танкавага корпуса. Нашы войскі, у тым ліку і Данскі танкавы корпус генерала Панова, прасунуліся на 12 км адразу. Жукаў, калі пра гэта даведаўся, не паверыў і прыехаў разам з Ракасоўскім і Новікавым у вёску Гамза, куды да таго часу перамясціўся камандны пункт. Яны пераканаліся, што войскі зрушыліся ўжо нават на 20 км. Да зыходу другога дня паглыбіліся ў абарону немцаў на 30 км. А далей было вызваленне Парыч, Жлобіна, разгром немцаў у Бабруйскім і Мінскім катлах... Ну, а потым — вызваленне не толькі Беларусі, але і ўсёй Еўропы. Таму гэта найунікальнейшая аперацыя.

— Вы збіралі і друкавалі ўспаміны франтавікоў яшчэ з сярэдзіны 60-х гадоў мінулага стагоддзя. Вам ветэраны даваралі свае шчырыя пачуцці і думкі...

— І гэта было зроблена своечасова, бо цяпер нічога аналагічнага ўжо знайсці немагчыма. Я запісаў шмат успамінаў людзей, апаленых вайной. Спрыяў таму, каб інвалід 1 групы Усевалад Мігай пісаў у газету, стаў членам Саюза журналістаў СССР. Дарэчы, ён пакінуў рукапіс кнігі, вёў такі своеасаблівы сямейны альбом, у які ўдзельнікі вайны запісвалі свае ўспаміны і выказванні. У Мігая засталіся нататкі, на аснове якіх мы з жонкай, паэтэсай Соф'яй Шах, падрыхтавалі і выдалі яго кніжку «Бярэзіна ў агні». Я сябраваў з камісарам партызанскай брыгады імя Панамарэнкі Яўгенам Рыгоравічам Садавым. Запісаў яго ўспаміны, якія потым зрабіліся кнігай пад назвай «Гэта стала лёсам». Сябраваў з Іванам Самойлавічам Каяфюком, былым камандзірам партызанскай разведкі, які пасля вайны будаваў горад Светлагорск. У вёсцы Данілоўка жыў без абедзвюх ног Іван Мацвеевіч Шакура... Пра многіх пісаў — гэта былі вельмі цікавыя людзі. Хоць у мяне больш за 20 паэтычных кніг, выдаў кнігу прозы, прысвечаную пасляваеннаму часу — «Уцёкі з дзяцінства». Мне было тры гады, калі пачалася вайна, і я мала што пра яе памятаю. Але ж бацька прайшоў і фінскую вайну, і ўсю Вялікую Айчынную ў пяхоце — быў палітруком. «Семь ран и пустой вещмешок припёр на родные руины», — напісаў я пра яго. Асколкі ў сваім целе, якія не змаглі выняць, ён панёс у магілу. Да таго ж, маці мая памерла ў дзень Перамогі 9 мая 1945 года. Штогод у гэты дзень я прысвячаю верш яе памяці. Ёсць у мяне яшчэ адна кніга — дакументальная аповесць «Бэз на папялішчы». Яна напісана пры садзейнічанні палкоўніка Пятра Далбы. У савецкі час ён меў доступ да дакументаў, да пратаколаў допытаў карнікаў, паліцаяў, якіх судзілі паля вайны. Гісторыя Надзеі Дзенісовіч, настаўніцы з Калінкавіцкага раёна, якая была стваральніцай і камісарам Даманавіцкага партызанскага атрада, стала фабулай кнігі. Надзею расстралялі фашысты і ледзь жывую закапалі. У гонар яе вёска Блудзім у Калінкавіцкім раёне была перайменавана ў вёску Дзенісовічы. Пра аперацыю «Багратыён» я напісаў невялікую дакументальную паэму, якая называецца «Брыдскі Мох». Рукапіс гэты зараз знаходзіцца ў Выдавецкім доме «Звязда». Спадзяюся, што ў хуткім часе кніжка такая пад назвай «Вернасць» пабачыць свет.

— Ад добрай ідэі да ўвасаблення — не заўсёды блізкі шлях. Хто дапамагаў ажыццявіць ідэю стварэння памятнага знака, прысвечанага аперацыі «Багратыён»?

— Любая добрая справа робіцца добрымі людзьмі. Людзям, якія пры ўладзе, цяжка рабіць нешта звыш сваіх абавязкаў, але ж ёсць тыя, хто гэта могуць. Мне пашанцавала, што ў нашым Светлагорскім раёне былі кіраўнікі менавіта такога кшталту. На працягу адзінаццаці гадоў узначальваў наш раённы камітэт Аляксандр Серафімавіч Якабсон. Леў Гумілёў калісьці гаварыў пра пасіянарыяў — людзей, якія сканцэнтроўваюць у сабе добрую, стваральную энергію і ўплываюць на час. Дык вось такім чалавекам для нас стаў Аляксандр Серафімавіч. Ён тут, у Светлагорску, дапамог зрабіць нашу карцінную галерэю «Традыцыя». Калі стаў старшынёй Гомельскага аблвыканкама, адкрыў у Гомелі галерэю Гаўрыіла Вашчанкі. Ім паўсюль вельмі шмат зроблена. Адноўлены палац Паскевічаў, адкрыты гомельскі філіял Веткаўскага музея, усталяваны помнік Кірылу Тураўскаму ў абласным цэнтры... Ён заўсёды меў жаданні і магчымасці. У Светлагорску адкрыты помнік заснавальніку паселішча — шляхцічу Раману Шацілу. У гэты час старшынёй райвыканкама быў пераемнік Аляксандра Якабсона — Беларусь Казіміравіч Пірштук. Калі кіраўніцтва раёна прыходзіла на нейкае ўрачыстае адкрыццё ў галерэі, я жартаваў, што можна праводзіць і выязное пасяджэнне райвыканкама. Таму, калі звярнуўся да Якабсона з прапановай менавіта ў тых мясцінах, дзе праходзіла аперацыя «Багратыён», устанавіць памятны знак, а потым узвесці мемарыяльны комплекс, той адразу адгукнуўся. Аднак потым пайшоў працаваць у Камітэт дзяржаўнага кантролю, і справа на нейкі час прыпынілася. Але ж не такі чалавек Аляксандр Серафімавіч. Калі за справу бярэцца, адчувае асабістую адказнасць і даводзіць яе да лагічнага завяршэння. Я быў яго памочнікам яшчэ тады, калі ён абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Потым ён прадстаўляў Гомельшчыну ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Гэта такі чалавек, які заўжды можа рабіць нешта добрае звыш сваіх службовых абавязкаў. І на гэты раз змог знайсці тых, ад каго залежыла ўзвядзенне памятнага знака. Пры Міністэрстве культуры стварылі рабочую групу па ўзвядзенні мемарыяльнага знака, і я быў яе членам. Разам з маёй жонкай і паплечніцай мы намалявалі пробны эскіз будучага мемарыяла. Райвыканкам абвясціў конкурс, у якім перамог гомельскі скульптар Валерый Кандраценка. А потым быў адкрыты дабрачынны рахунак. Першы мільён грошай на яго пералічыў мінчанін Ілья Гарбачэўскі. У вайну ён быў падпольшчыкам. Расказваў, што немцы яго з сябрамі схапілі і павінны былі пакінуць Саюзнай дзяржавы. Аляксандр Серафімавіч звярнуўся з пісьмом да яе дзяржсакратара Рыгора Рапоты, і ён падтрымаў гэтую ініцыятыву. Зараз вядома, што 32 мільёны расійскіх рублёў выдаткавана для гэтага мемарыяльнага знака. Але ж калі справа скончыцца толькі яго ўстаноўкай, будзе вельмі крыўдна. Патрэбен мемарыяльны комплекс з двухпавярховым музеем, каплічка, каб паставіць памінальную свечку. Трэба аднавіць бліндаж генерала Батава і фрагменты траншэй, гацяў. Непадалёку знаходзіцца месца падзення самалёта Героя Савецкага Саюза лётчыка Сяргея Краснапёрава, які ўпаў у балота і ў ім загінуў. Хацелася б, каб туды таксама быў пракладзены маршрут. Увогуле лічу, што такі комплекс павінен стаць філіялам музея Вялікай Айчыннай вайны. Экспанатаў для яго хопіць. Генерал арміі Павел Батаў яшчэ пры яго жыцці стаў ганаровым грамадзянінам Светлагорска. Ён ахвяраваў нашаму музею асабістыя рэчы. На нашай зямлі ваявалі і перамагалі маракі Дняпроўскай флатыліі...

— З часу заканчэння вайны прайшло амаль 70 гадоў. Ці магчымы яшчэ нейкія адкрыцці?

— Шмат. Напрыклад, я сам даведаўся з вялікай цікавасцю, што ў аперацыі «Багратыён» прымалі ўдзел іспанскія лётчыкі, якія бралі рускія прозвішчы — па прыкладзе тых нашых інтэрнацыяналістаў, што ваявалі ў Іспаніі і бралі іспанскія прозвішчы. А колькі невядомага ў нас тут пра ўдзел у баявых дзеяннях маракоў Дняпроўскай флатыліі! Думаю, таямніцы яшчэ ёсць, і менавіта аперацыя «Багратыён» выратавала яму жыццё. Дарэчы, наконт памятнага знака. На рахунак пачалі паступаць сродкі, але ж мы ўвесь час хацелі, каб гэтая справа фінансавалася за кошт Саюзнай дзяржавы. Аляксандр Серафімавіч звярнуўся з пісьмом да яе дзяржсакратара Рыгора Рапоты, і ён падтрымаў гэтую ініцыятыву. Зараз вядома, што 32 мільёны расійскіх рублёў выдаткавана для гэтага мемарыяльнага знака. Але ж калі справа скончыцца толькі яго ўстаноўкай, будзе вельмі крыўдна. Патрэбен мемарыяльны комплекс з двухпавярховым музеем, каплічка, каб паставіць памінальную свечку. Трэба аднавіць бліндаж генерала Батава і фрагменты траншэй, гацяў. Непадалёку знаходзіцца месца падзення самалёта Героя Савецкага Саюза лётчыка Сяргея Краснапёрава, які ўпаў у балота і ў ім загінуў. Хацелася б, каб туды таксама быў пракладзены маршрут. Увогуле лічу, што такі комплекс павінен стаць філіялам музея Вялікай Айчыннай вайны. Экспанатаў для яго хопіць. Генерал арміі Павел Батаў яшчэ пры яго жыцці стаў ганаровым грамадзянінам Светлагорска. Ён ахвяраваў нашаму музею асабістыя рэчы. На нашай зямлі ваявалі і перамагалі маракі Дняпроўскай флатыліі...

— З часу заканчэння вайны прайшло амаль 70 гадоў. Ці магчымы яшчэ нейкія адкрыцці?

— Шмат. Напрыклад, я сам даведаўся з вялікай цікавасцю, што ў аперацыі «Багратыён» прымалі ўдзел іспанскія лётчыкі, якія бралі рускія прозвішчы — па прыкладзе тых нашых інтэрнацыяналістаў, што ваявалі ў Іспаніі і бралі іспанскія прозвішчы. А колькі невядомага ў нас тут пра ўдзел у баявых дзеяннях маракоў Дняпроўскай флатыліі! Думаю, таямніцы яшчэ ёсць, і

Першы мільён грошай на мемарыял пералічыў мінчанін Ілья Гарбачэўскі. Ён лічыць, што менавіта аперацыя «Багратыён» выратавала яму жыццё.



Ізяслаў КАТЛЯРОЎ і Соф'я ШАХ.

менавіта аперацыя «Багратыён» выратавала яму жыццё. Дарэчы, наконт памятнага знака. На рахунак пачалі паступаць сродкі, але ж мы ўвесь час хацелі, каб гэтая справа фінансавалася за кошт Саюзнай дзяржавы. Аляксандр Серафімавіч звярнуўся з пісьмом да яе дзяржсакратара Рыгора Рапоты, і ён падтрымаў гэтую ініцыятыву. Зараз вядома, што 32 мільёны расійскіх рублёў выдаткавана для гэтага мемарыяльнага знака. Але ж калі справа скончыцца толькі яго ўстаноўкай, будзе вельмі крыўдна. Патрэбен мемарыяльны комплекс з двухпавярховым музеем, каплічка, каб паставіць памінальную свечку. Трэба аднавіць бліндаж генерала Батава і фрагменты траншэй, гацяў. Непадалёку знаходзіцца месца падзення самалёта Героя Савецкага Саюза лётчыка Сяргея Краснапёрава, які ўпаў у балота і ў ім загінуў. Хацелася б, каб туды таксама быў пракладзены маршрут. Увогуле лічу, што такі комплекс павінен стаць філіялам музея Вялікай Айчыннай вайны. Экспанатаў для яго хопіць. Генерал арміі Павел Батаў яшчэ пры яго жыцці стаў ганаровым грамадзянінам Светлагорска. Ён ахвяраваў нашаму музею асабістыя рэчы. На нашай зямлі ваявалі і перамагалі маракі Дняпроўскай флатыліі...

— З часу заканчэння вайны прайшло амаль 70 гадоў. Ці магчымы яшчэ нейкія адкрыцці?

— Шмат. Напрыклад, я сам даведаўся з вялікай цікавасцю, што ў аперацыі «Багратыён» прымалі ўдзел іспанскія лётчыкі, якія бралі рускія прозвішчы — па прыкладзе тых нашых інтэрнацыяналістаў, што ваявалі ў Іспаніі і бралі іспанскія прозвішчы. А колькі невядомага ў нас тут пра ўдзел у баявых дзеяннях маракоў Дняпроўскай флатыліі! Думаю, таямніцы яшчэ ёсць, і

У Расіі толькі што створана арганізацыя «Народная памяць». Яна займаецца абаронай праўды пра вайну. Было б вельмі добра, калі б і ў Беларусі было створана аналагічнае грамадскае аб'яднанне.

Эскіз мемарыяльнага комплексу ў гонар аперацыі «Багратыён».

КУЗНЯ КІРАЎНІКОЎ-ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

Гэтымі днямі кафедра тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь адзначае сваё 20-годдзе. Падлічана, што за 20 гадоў кафедрай былі падрыхтаваны 3,5 тысячы запатрабаваных сферай дзяржаўнага кіравання спецыялістаў. Сярод яе выпускнікоў — міністр юстыцыі Алег Слижэўскі, сакратар Рэспубліканскай камісіі па правядзенні выбараў і рэферэндумаў Мікалай Лазавік, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па Мінску Фёдар Дамаценка, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерый Вакульчык, старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька, першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў і многія іншыя дзяржаўныя дзеячы.

Сёння на кафедры працуюць 20 штатных выкладчыкаў і 14 сумяшчальнікаў, у тым ліку акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, 9 дактароў навук і 12 кандыдатаў навук. Выкладчыкі кафедры актыўна ўкараняюць інавацыйныя адукацыйныя тэхналогіі, выкарыстоўваюць міжнародны вопыт, рэалізуюць прынятыя ў сусветнай практыцы стандарты навучання. У працэсе вучобы для слухачоў арганізуюцца выязныя заняткі ў дзяржорганы і на прадпрыемствы краіны.

А ў студзені гэтага года слухачы спецыяльнасцяў «Дзяржаўнае і мясцовае кіраванне» і «Дзяржаўнае кіраванне нацыянальнай эканомікай» праходзілі замежную стажыроўку ў Германіі і Чэхіі, дзе вывучалі сучасныя мадэлі дзяржаўнага і муніцыпальнага кіравання.

Ёсць усе падставы спадзявацца, што наладжаныя кантакты дазволяць актывізаваць інвестыцыйнае супрацоўніцтва нашай краіны з нямецкімі і чэшскімі дзелавымі кругамі, а сама стажыроўка дапаможа сфарміраваць сучасныя кіраўніцкія кампетэнцыі, неабходныя кожнаму кіраўніку.

Ул. інф.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона),
по поручению Открытого акционерного общества
«Слуцкий пивоваренный завод»
(продавец),

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже одним лотом имущества:

здание административного корпуса, общ. пл. 2168.9 кв. м (инв. № 640/С-27293); весовая, общ. пл. 25.8 кв. м (инв. № 640/С-27303); переходная галерея, общ. пл. 65 кв. м (инв. № 640/С-27304); элеватор, общ. пл. 1414.3 кв. м (инв. № 640/С-27309); главный производственный корпус, общ. пл. 12370 кв. м (инв. № 640/С-27312); проходная, общ. пл. 30.8 кв. м (инв. № 640/С-27313); незавершенное законсервированное капитальное строение, общ. пл. 440.2 кв. м (инв. № 640/U-72996); оборудование элеватора на земельном участке, площадью 3.1450 га по адресу: г. Слуцк, ул. Тутаринова, 1;

трансформаторная подстанция, общ. пл. 40,2 кв. м (инв. № 640/С-27297); насосная станция (станция 2 подъема), общ. пл. 116.9 кв. м (инв. № 640/С-51797) на земельном участке, площадью 0,1960 га по адресу: г. Слуцк, ул. Головащенко;

скважина № 8 (инв. № 640/С-27298) и ограждение.

Начальная цена – 12 677 609 840 бел. руб. (стоимость снижена на 30%). **Задаток 10% от начальной цены (1 267 760 984 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 04.03.2014.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится 30.06.2014 в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 27.06.2014 до 16.00 по указанному адресу.**

Тел: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»

30 июня и *10 июля* 2014 года
состоятся **внеочередные общие собрания акционеров**
ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»,
расположенного по адресу:
г. Лида, ул. Советская, 70 (конференц-зал)

Повестка дня собрания 30 июня 2014 года:
1. Об открытии подписки на акции дополнительного выпуска.

Повестка дня собрания 10 июля 2014 года:
1. Об утверждении результатов подписки на акции дополнительного выпуска ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».
2. Об увеличении размера уставного фонда ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».
3. О внесении изменений в устав ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».

Начало работы собраний в 12.00.
Регистрация участников собрания с 11.00 до 11.50.

Наблюдательный совет
УНП 100625309 **ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»**

Ксенія ЛУЦКІНА:

«ЖЫЦЦЁ ВІРУЕ НЕ ТОЛЬКІ Ў ГОРАДЗЕ»

Другі сезон навукова-папулярнага дэтэктыва «Terra incognita. Беларусь невядомая» на тэлеканале «Беларусь 1» стартаваў на мінулым тыдні. Стваральнікі праграмы прапануюць гледачам чарговую серыю ўнікальных праграм, дзе іх чакае поўнае экстрыму падарожжа па Беларусі, падчас якога з'явіцца магчымасць зазірнуць за межы ўласных ведаў. Пра закадравыя прыгоды і непаўторныя ўражанні — аўтар праекта Ксенія ЛУЦКІНА.

— 13 чэрвеня адбылася прэм'ера другога сезона «Terra incognita. Беларусь невядомая». Што чакае гледачоў у новых выпусках?

— Шмат цікавага. Мы, пачынаючы праект, выбралі канцэпцыю навукова-папулярнага шоу-дэтэктыва. Таму для нас саміх кожны выезд на здымкі — гэта сюрпрыз, бо і для сябе мы многае адкрываем. Тут такая колькасць тэм, што праект можна рабіць бясконца. У нас праграма экалагічнай накіраванасці — такая задума была з самага пачатку. Вырашылі ісці шляхам апавядання пра нейкія тэрыторыі, якія нават калі і на слыху, ведаем мы пра іх мала. А заўсёды ж цікава, як і што ўнутры, чаму так і г. д. Паглыбляешся ў нейкую тэму, і пачынаецца той самы дэтэктыў, які ў кожнага ўдзельніка здымачнай групы свой. Вельмі важна, якую інфармацыю ты збярэш і якім будзе канчатковы вынік.

— У чым адметнасць другога сезона?

— Хочам зрабіць серыю падводных праграм. Летась у нас ужо быў такога кшталту вопыт, мы шукалі Нэсі ў Беларусі. Апускаліся на дно самага глыбокага возера краіны — Доўгага, што ў Глыбоцкім раёне. У новым сезоне хацела б прадоўжыць гэты напрамак. На прыкмеце ўжо пяць месцаў, куды, на мой погляд, зазірнуць трэба абавязкова. Напрыклад, у нас ёсць азёры, дзе водзіцца рыба сняток — яна захавалася з часоў паслялednіковага перыяду. І ўсяго толькі два чалавекі засталіся з тых, хто ўмее яе правільна лавіць і гатаваць. У кіно такіх людзей называюць «знікаючая натура». Мне вельмі хацелася б не ўпусціць момант і зрабіць пра гэта праграму. Раз цікава мне, то і іншых змагу зацікавіць. Яшчэ ў Беларусі ёсць месца, дзе сто крыніц б'юць амаль з адной кропкі. І ў новым сезоне будзе добрая праграма аб перапрацоўцы смецця.

— Збіраецеся здзіўляць нейкім эксперыментам?

— Не тое што эксперыментам, проста будзе праграма экалагічнай накіраванасці. Праблема смецця насамрэч вельмі баліць многім. Бывае, нават здзіўляешся месцам, у якіх сустракаеш яго. Больш за ўсё мяне ўразіла ўбачанае на гары Маяк у Браславе. Там на самым высокім месцы ёсць альтанка, і ў ёй пад купалам надпіс плаўленым пакетам: «Тут быў Вася». Тэму смецця мы даволі доўга абмяркоўвалі і хацелі агучыць. І вось пабывалі ў горадзе Масты, дзе працуе праграма па раздзельным зборы смецця, і яна даведзена да лагічнага завяршэння. Калі бачыш, як на закрытым палігоне расце лес, гэта ўражвае.

— Што дае вам штуршок для пошуку тэм?

— Тут усё вельмі па-рознаму бывае. Часам слова дастаткова, каб пачаць даследаванне. Я з першага дня працую ў навукова-папулярным жанры, гэта, безумоўна, уплывае на фармат мыслення. Ведаеш шмат людзей насамрэч зацікаўленых. Акрамя таго, я вучуся ў аспірантуры Белдзяржуніверсітэта, і багаж ведаў, набыты там, таксама пастаянна папаўняецца. А ў выніку, працуючы на стыку навукі і тэлебачання, я нават многія гістарычныя тэмы адкрыла для сябе па-новаму. Просты прыклад: пра казацка-сялянскі рух ведае кожны дзевяцікласнік. Аднак звярніце ўвагу, казакі ходзяць вакол «трох» населеных пунктаў. Чаму яны там ходзяць, пакуль не ўбачыш тыя месцы, не зразумееш. Аказваецца, дарог не было. І толькі дзякуючы меліярацыі яны з'явіліся. На Палессі ёсць і сёння незаселеныя тэрыторыі. Мы туды абавязкова паедзем. Уявіце, некалькі тысяч гектараў тэрыторый — і ніводнага чалавека! Гэта балоты з астравамі. Раней тут была сельская гаспадарка. Людзі перамяшчаліся на лодках, а ў госці хадзілі адзін да аднаго зімой, калі ўсё замярзала. Мы перад сабой ставім, магчыма, экстрэмальныя задачы, бо спрабуем туды пранікнуць самі, незалежна ад пары года. Праграма ж у нас цяпер штотыднёвая. Але мы не баімся, што тэмы могуць скончыцца.

На Палессі ёсць і сёння незаселеныя тэрыторыі. Мы туды абавязкова паедзем. Уявіце, некалькі тысяч гектараў тэрыторый — і ніводнага чалавека!

— Вы неяк казалі, што з'яўляецеся гараджанкай у сёмым пакаленні. Якія адкрыцці робіце асабіста для сябе?

— Самае галоўнае, чым была ўражана літаральна два тыдні таму, — як наш аператар здымаў змяю на дарозе. Я спакойна гляджу, як ён за ёю бяжыць, і кажу: «Сяро-жа, акуратна!» У адказ: «Я бягу за вужом!». А калі гэты «вуж» знік у траве, я сказала, што здымаў ён шэрую гадзюку. Каб хто гады два таму сказаў, што я змагу так на ўсё спакойна рэагаваць, не паверыла б. А цяпер ведаю: не чапай змяю, і яна цябе не пакусае. Яны баяцца нас больш, чым мы іх… Нельга рабіць такія праграмы, калі табе нецікава. Абыякавасць не дасць нічога, акрамя абыякавасці гледача. А ў нас чым далей «у лес», тым больш інтарэсу, і ён толькі ўзрастае. Сёлета для мяне сапраўдным адкрыццём стаў Тураўскі луг. Мы там плавалі на байдарцы, таксама любаваліся птушкамі. Прыгожыя карціны, якія бачыш у такіх падарожжах, нават складана апісаць. Плюс да ўсяго, у нас жа навукова-папулярная праграма, таму шукаем адказы на пытанні, каб патлумачыць прычыну і вынік, даведацца больш.

— Непрадбачаныя сітуацыі часта здараюцца?

— Якое надвор'е выпадае на час здымак, пры такім і працуем. З гэтай нагоды члены групы нават жартуюць, што я магу спыніць любы рух на вуліцы горада, калі патрэбна, а вось надвор'е «замовіць» не заўсёды ўдаецца. Ідзе дождж альбо свеціць сонца — мы здымаем. Ездзім на кані, балотаходзе, ходзім па балоце, працуем пры аранжавым узроўні небяспекі. Мы прафесіяналы, і калі бярэмся за такую справу — павінны ведаць, на што ідзём і чаго хочам дасягнуць.

— На такіх сустрэчах з прыродай удаецца адчуць еднасць з ёю, гармонію?

— Мы не турысты, і здымкі праходзяць у напружаным графіку. Часу ў нас няшмат, а задач для выканання багата. Але, калі выпадае, то спыняешся і атрымліваеш асалоду ад назірання за навакольнымі пейзажамі… Вось у нас будзе дзве праграмы са Столінскага раёна, дзе спачатку шукаем радзіму Змея Гарыныча, а потым расказваем пра комплекс Альманскіх балот. Калі рабілі другую праграму, то былі ў месцы, дзе ў радыусе 40 кіламетраў няма ніводнага жыхара. Там вельмі цікавы чалавек працуе вартаўніком, егерам у тых мясцінах. Ён па шапаценні лістоты можа сказаць вам, які звер ідзе, альбо па мелодыі распазнаць птушку. А ў Белавежскай пушчы мне адзін супрацоўнік сказаў: «Прыязджай вясной, будзем слухаць, як трава расце!» Яны чуюць нават такое… Атрымліваецца, калі ты аказваешся далёка ад дарогі, дзе ўсе ходзяць, вельмі абвастраюцца ўсе пачуцці. Ты чуеш тое, чаго ў горадзе пачуць не здольны.

— Працуючы на праекце, не думалі пра тое каб жыць не ў горадзе?

27	Сети канализации (инв. № 98626)	640/С-84379	-
28	**Оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона)**		

Указанные объекты расположены на земельном участке, площадью 8,4478 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101. Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га. Имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

Начальная цена снижена на 40% и составляет с НДС – 46 980 650 880 бел. руб. Задаток 5% от начальной цены (2 349 032 544 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 28.05.2014.

Аукцион состоится 30.06.2014 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 27.06.2014 до 16.00 по указанному адресу.**

Тел: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.

■ «Трэці» ўзрост

НА АДНОЙ ХВАЛІ З УНУКАМІ

ЯК ВЕДЫ АБ'ЯДНОЎВАЮЦЬ ПАКАЛЕННІ

У Мінску завяршыўся другі этап адукацыйнага праекта «Сеціву ўсе ўзросты пакорныя», арганізаваны Беларускай асацыяцыяй сацыяльных работнікаў, Фондам ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) і мабільным аператарам «МТС» у межах праграмы «Універсітэт трэцяга ўзросту». Праект падтрымалі Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама і адміністрацыі раёнаў горада. А з кастрычніка плануюць пашырыць геаграфію праекта, распаўсюдзіўшы яго на іншыя рэгіёны Беларусі.

За чатыры месяцы адукацыйны курс «Сеціву ўсе ўзросты пакорныя» прайшлі больш за 450 пажылых людзей, а ў цэлым за час існавання праграмы (праект стартаваў у кастрычніку 2013 года) дыпломы аб заканчэнні курсаў камп'ютарнай і інтэрнэт-граматнасці атрымалі 800 чалавек. Заняткі праводзілі выкладчыкі-валанцёры, сярод якіх былі студэнты, журналісты, настаўнікі, эканамісты, супрацоўнікі ІТ-кампаній і аператары «МТС». Заняткі праходзілі на базе тэрытарыяльных цэнтраў Кастрычніцкага, Фрунзенскага, Цэнтральнага і Першамайскага раёнаў сталіцы.

— Галоўная мэта праекта — навучыць пажылых людзей камп'ютарнай грамаце, а больш глабальная задача — навучыць два пакаленні размаўляць на адной мове. Каб не атрымалася так, што з выхадам на пенсію людзі былі адрэзаны ад сучаснага свету, каб у іх была магчымасць актыўна ўдзельнічаць у жыцці грамадства, працягваць развівацца, асвойваць новыя прафесіі і ўсебакова рэалізоўвацца, — расказвае **спецыяліст па сувязях з грамадскасцю Фонда ААН у галіне народанасельніцтва Вольга ГЕРАСЕНКА.** — Падуе, што ўзрастае колькасць зацікаўленых і матываваных людзей. Адных матывуе жаданне быць на сувязі з дзецьмі, іншых — задумка напісаць мемуары альбо жаданне падзяліцца нейкімі цікавымі напрацоўкамі. Яны хочуць вучыцца і, сутыкаючыся з цяжкасцямі, не спыняюцца, хоць і не ўсё атрымліваецца адразу.

Па выніках даследавання, праведзенага спецыялістамі «МТС», 45 працэнтаў пажылых людзей прынялі ўдзел у праекце з мэтай навучыцца працаваць з праграмамі і сэрвісамі галасавой і тэкставай анлайн-гутаркі. Skype, Facebook, Instagram, «Аднакласнікі» і іншыя сацыяльныя сеткі меседжары дазваляюць фотаздымкі, музычныя і відэафайлы.

— Матывацыя ў мяне была простая — лепш вывучыць камп'ютар. Я працавала інжынерам-праекціроўшчыкам, таму з тэхнікай мела справу. У асноўным на камп'ютары вывучала дакументацыю, друкавала нешта — не больш за тое. Дома ў нас ёсць камп'ютар, таму з'явілася жаданне ім карыстацца. Пачула аб'яву па радыё і загарэлася ідэяй, — дзеліцца гісторыяй свайго прыходу на праект Адэль. Ёй 74 гады, і яна нядаўна перамагла на «Сямейным марафоне. Web 60», прымеркаваным да Міжнароднага дня сям'і. Там пакаленні бабуль і дзядуляў мераліся ведамі па валаданні камп'ютара са сваімі ўнукамі.

— Хацела працаваць у інтэрнэце без страху — і цяпер ужо адчуваю сябе ўпэўнена. Усім знаёмым расказваю, як можна атрымаць дадатковую адукацыю бясплатна, — кажа жанчына.

А вось Марыя, таксама выпускніца другога этапу, успамінае: «Сын спачатку скептычна паставіўся да маёй задумкі, маўляў, навошта табе гэта? Я сказала, што без камп'ютара цяпер нікуды, бо такі час. Трэба быць у курсе, а то раптам спатрэбіцца даведацца расклад аўтобуса, пачытаць пра новыя прэм'еры ў тэатры ці яшчэ нешта. Цяпер нават з унукам гуляем у «Скарбы піратаў», змагаемся і радуемся новым перамогам у камп'ютарных паядынках».

Немалаважна, каб у такіх памкненнях старэйшае пакаленне падтрымлівалі родныя і блізкія: дапамагалі, трэніравалі, не адмаўляліся нешта патлумачыць.

— Пажылых людзей, якія ўпэўнена валодаюць камп'ютарам, у Беларусі пакуль яшчэ не шмат, але сітуацыя мяняецца ў лепшы бок, — адзначыў кіраўнік дэпартамента «МТС» Яўген Брынцаў. — Бясплатная адукацыйная праграма «Сеціву ўсе ўзросты пакорныя» змяніла жыццё многіх пенсіянераў — дапамагла ім адаптавацца ў сучасным інфармацыйным грамадстве. Акрамя таго, праект атрымаў падтрымку на дзяржаўным узроўні, што дазволіць яму развівацца і ў іншых рэгіёнах Беларусі.

Алена ДРАПКО

■ Неасабісты суб'ектыў

ЭПОХА ЎРБАНІСТАЎ

Чаго чакаць ад пакалення, якое будзе думаць, што катлеты растуць у халадзільніку, а малако выскоквае з каровы проста ў пакетах?

Я станцыі метро «Каменная горка», на самым «дачным» выездзе са сталіцы — сапраўдны кірмаш. Цыбуля, кроп, клубніцы, нават першыя чарніцы і лісічкі. Нарады міліцыі, што раз-пораз шпацыруюць між стыхійных прадаўцоў, рады даць не могуць: бабулі навучыліся ў адно імгненне падхопліваць свае валізкі і змешвацца на прыпынку з натоўпам, які чакае аўтобус ці тралейбус… Міліцыя пройдзе — і зноў пачынаецца бойкі гандаль, асабліва ўвечары, калі стомленыя гараджане цягнуцца з работы.

«Пачым клубніцы?» — пытаюцца дзве маладзенькія, гадоў па шаснаццаць, дзяўчыны, у кабеты з загарэлым да рудога тварам, з такімі ж рудымі напрацаванымі рукамі. Пачуўшы цану — пятнаццаць тысяч за паўлітра, трыццаць — за літр, пагардліва чмыхаюць: «Ты, пэўна, бабка, з глузду з'ехала! За гэтыя грошы два літры піва купіць можна і два пачкі чыпсаў!» «Але ж працы колькі, дзеткі», — спрабавала пярэчыць жанчына. «Якая там праца! Уткнуў у зямлю куст ды ягады сабраў!»

Я, калі шчыра, тых клубніц і купляць не збіралася: у выхадныя была ў вёсцы, наелася ўволю. Але, панаіраўшы за «зялёнымі» рафінаванымі гараджанкамі, моўчкі выняла з кашалька пятнаццаць тысяч і павезла дадому жмені паўтары духмяных ягад. І грошай тых было зусім не шкада. Бо каб тую жменю ягад вырасціць, трэба з самай вясны стаяць крукам на градзе: то выкалупваючы нажом з кустоў усюдыісны малачай, то падкормліваючы, то падсыпаючы пілавінне, каб ягады не гнілі, то абразаючы вусы, то зноў беручыся за матыку ды нож — сёлета з-за дажджоў пустазелле так і прэ… Але як патлумачыць гэта тым дзяўчынкам і сотням іх равеснікаў, якія паняцця не маюць, што такое цяжкая, штодзённая праца на зямлі? Як пасяліць у юных галовах разуменне таго, што гэтая праца і людзі, ёй адданыя, вартыя элементарнай павагі і ўдзячнасці?

Давайце прызнаемся шчыра: мы — нацыя, якая выйшла з вёскі (і пра гэта варта казаць з гонарам, бо менавіта дзякуючы гэтаму мы такія «трывушчыя», паслядоўныя ў дзеяннях, упартыя ў дасягненні мэты), цяпер гадуем пакаленне ўрбаністаў — людзей, да вясковага жыцця абсалютна непрыстасаваных (гэта яшчэ паўбяды, тэхнічны прагрэс не дасць ім прапасці), якія да працы на зямлі не прывучаны і не маюць ніякага жадання да гэтай працы далучацца. Калі так далей пойдзе — выгадуем пакаленне, якое будзе думаць, што катлеты растуць у халадзільніку, а малако выскоквае з каровы проста ў пакетах…

Нехта запярэчыць: маўляў, нам гэта не пагражае, любоў да зямлі ў нас у генах, нават тыя, хто перасяліўся ў горад, не могуць без яе жыць: ці не ў кожнага гараджаніна лецішча. Пра гэта і лічбы сведчаць: у краіне чатыры з паловай тысячы садоўніцкіх таварыстваў, у якіх пад чатырыста тысяч зямельных участкаў. І гэта не лічачы «скрытых дачнікаў» — тых, каму ў спадчыну дасталіся бацькоўскія хаты ў вёсках. І на кожным участку шчыруюць, бо шэсць сотак, засеяныя газоннай травой і засаджаныя дэкаратыўнымі кустамі —- гэта не пра нас. Прынамсі, пакуль што… Але хто на тых сотках шчыруе? Чатырнаццаці-шаснаццацігадовых вы ўбачыце там усё радзей. У іх іншыя клопаты, больш важныя справы, чым дапамагчы бацькам на дачы, — пасядзець за кап'ютарам, напрыклад. Мы самі ім у гэтым патураем: маўляў, што прымушаць дзіця, хай адпачывае ды вучыцца… Што ў гэтым такога, спытаеце? Ды нічога. Проста з пачаткам летніх канікул, калі распачынаецца «працоўная чвэрць», не ведаеш ці то смяяцца, ці то шкадаваць гарадскіх школьнікаў, такіх вялікіх і здаровых, але ж такіх нязграбных, якія не ведаюць, як трымаць граблі і з якога боку падступіцца да рыдлёўкі… А калі зазірнуць далей — што будзе праз некалькі дзесяцігоддзяў з тымі чатырохстамі тысячамі ўчасткаў, калі іх у спадчыну атрымаюць такія вось, выбачайце, недарэкі?

Працэс урбанізацыі — перавагу горада над вёскай — не спыніць, ён захапіў увесь цывілізаваны свет. Але адно застаецца нязменным: корміць гэты свет менавіта зямля і людзі, што на ёй працуюць. І павага да гэтых людзей, і ўвага да іх павінны быць адпаведныя. І гэтая праблема хоць і з разраду хутчэй маральна-этычных, не менш важная, чым балючыя кропкі ў эканоміцы і арганізацыі работы аграпрамысловага комплексу, якія сёння абмяркоўваюцца ў нас на самым высокім узроўні.

…Суседні з нашым домам участак, які пасля смерці адзінокага гаспадара выставілі на аўкцыён, перапрадаецца за два гады ўжо трэці раз. Першыя пакупнікі, маладыя жыхары сталіцы, спачатку ахкалі і вохкалі ад захаплення: стары сад, побач рэчка, салаўі спяваюць, траўка шаўкавістая… Захапленне скончылася, калі шаўкавістая траўка пачала расці. Яе, як нечакана высветлілася, трэба было касіць. А потым зграбаць і насіць. А яна адрастала зноў… Восенню ўчастак зноў выставілі на продаж. Наступныя гаспадары — сталічны прафесар з сям'ёй — рыхтаваліся будаваць хату, нават спілавалі старыя яблыні і ўбілі калкі пад фундамент. На гэтым імпэт быў вычарпаны: дачка абламала пазногці і пакалола ногі, сын намуляў мазалі. «Мы не созданы для этого», — казала наша няспраўджаная суседка, развітваючыся… Старыя спілаваныя яблыні так і засталіся ляжаць і зараз цягнуць чорныя галіны-рукі з высачэзнай травы, бы просячы аб літасці…

«Як знак таго, што будзе з усёй вёскай гадоў праз трыццаць», — падумалася нядаўна, калі глядзела на іх праз шыбу роднай хаты. А можа, проста самотная фантазія пад дождж разгулялася?..

Алена ЛЯЎКОВІЧ

■ Прыгожыя і дзелавыя

БРЫЛЬЯНТЫ ДЛЯ ЛЭДЗІ-БОС

Фота Паўла ПАТАШНІКАВА

Сёлетняя ўладальніца тытула «Лэдзі Бос» — заснавальнік і генеральны дырэктар групы кампаній «Мальнар» 48-гадовая Аксана Чуракова — атрымала ў падарунак калье з 59 белымі і 19 чорнымі брыльянтамі ў выглядзе кветкі з матавага золата. Сфера дзейнасці кампаній «Мальнар» — нерухомасць (пакупка-продаж, арэнда доўгатэрміновая і на суткі, нерухомасць жылая, камерцыйная і загарадная), а таксама грузаперавозкі.

Праект «Лэдзі Бос» вось ужо трэці раз адбываецца па ініцыятыве інтэрнэт-рэсурсу для жанчын LADY. TUT.BY. Паводле слоў кіраўніка праекта Святланы Зэрэ, у нашых бізнес-лэдзі атрымліваецца і ўдала кіраваць кампаніямі, і знаходзіцца ў абсалютнай гармоніі з сабой і навакольным светам.

Са ста прэтэндэнтак да фінішу падышлі 12 самых-самых, якіх чакалі дзевяць этапаў конкурсу. Да мінулагодніх этапаў дадаліся выраб відэавізітак, boss-movie (міні-стужка пра сябе і сваю кампанію дзеля дэманстрацыі творчага патэнцыялу і амбіцый), дзелавая фотасесія (ад лепшых беларускіх фатографаў), маркетынгавая дыскусія, выхад у свет і майстар-клас дзелавога этыкету, прэзентацыя кампаніі і нават… сплаў на байдарках па рацэ Ислач.

Сярод удзельніц — як заснавальнікі ўласных гандлёвых марак, так і кіраўнікі сямейнага бізнесу. Сферы дзейнасці — тэлекамунікацыі, вытворчасць корпуснай мэблі, бытавой тэхнікі і электронікі, прамысловая зварка, аўдытарскія і юрыдычныя паслугі, рознічны гандаль, аўтарская мэбля, продаж высокатэхналагічнага дзіцячага адзення і абутку, падарожжы, турызм, інфармацыйныя тэхналогіі для гасцінічнага бізнесу, апаратная касметалогія, аперацыі з нерухомасцю.

Святлана БАРЫСЕНКА

■ Фінансавы выдатнік

«КАЛІ ГРОШЫ БЯРЭШ З МЭТАЙ, ЯНЫ ІДУЦЬ НА КАРЫСЦЬ…»

Адна крэдытная гісторыя, якая прынесла ўдачу

Сёння мы раскажам вам пра карыстанне крэдытамі, але паглядзім на гэта зусім з іншага боку. Так бы мовіць, заглянем за кулісы гэтай з'явы. Раней мы давалі вам парады з вуснаў банкаўскіх спецыялістаў, а цяпер прапануем паслухаць аповед пра карыстанне крэдытамі ад чалавека, якому пазычаныя грошы вельмі дапамаглі.

РАЗУМЕЙ, НА ШТО ІДЗЕШ

Таццяна Родзіна са старажытнага горада Ліда ніколі не скардзілася на жыццё, хаця яно і падаравала ёй шмат выпрабаванняў і цяжкасцяў. Аднак і на шчасце лёс быў таксама шчодры: дзве дачкі і сын сталі галоўным скарбам жанчыны. Расціць адной трох дзяцей, зразумела, цяжка былому кухару дзіцячага садка, а цяпер памочніку выхавацеля ў тым жа садку. «Мая зарплата заўсёды была не самай вялікай. Вось і даводзілася пазычаць, — гаворыць Таццяна Родзіна. — Спачатку ў знаёмых, а пасля маці аднаго з гадаванцаў прапанавала звярнуцца ў банк. Там не адмовілі, толькі патрэбны быў паручыцель. Ім стала мая выхавацелька. З гэтым крэдытам я ў тэрмін разлічылася — і ў банку мне сталі давяраць. Прапанавалі крэдытную картку, якой я і цяпер часам карыстаюся».

Нягледзячы на тое, што жанчына ўжо на пенсіі, энергіі ў яе шмат. «Добра яшчэ, што дзяржава дазваляе пенсіянерам працаваць, — лічыць Таццяна Мікалаеўна. — Жыццё ёсць жыццё. Трэба змагацца, каб жыць. Не ленавацца. Не варта чакаць, што нешта дадуць, прынясуць».

Увогуле, Таццяна Родзіна — вельмі актыўны карыстальнік банкаўскіх паслуг. У яе ёсць ашчадная пенсійная картка, якой яна пастаянна карыстаецца. «Нават проста ў краме расплачваюся, каб у кашальку не насіць тыя грошы. Гэта вельмі зручна. Адно толькі дрэнна, што ў чэку трэба распісвацца. Узяла пакет малака і батон, разлічылася — і тут жа касір просіць распісацца. Атрымліваецца, што чаргу затрымліваю. А так мне ўсё падабаецца. Вось толькі пакуль што зберагаць не атрымліваецца. Нічога, капітальны рамонт скончыцца ў доме — і буду патроху адкладваць». Ды і дзеці ўжо дарослыя, хутка пачнуць самі маці дапамагаць.

Шматдзетная маці раіць, зыходзячы са свайго вопыту, заўсёды правільна ацэньваць свае магчымасці: «Калі грошы бярэш з мэтай, яны ідуць на карысць. Калі адказна да ўсяго ставіцца, то крэдыт — гэта не страшна. Ты проста павінен разумець, на што ідзеш. Я ніколі не брала вялікіх сум, толькі тое, што я дакладна змагу вярнуць. Калі з грашыма гуляць, то сумленна: узяў — аддавай».

Шчыры чалавек, добрая маці, сумленны работнік… Ёй абавязкова павінна была ўсміхнуцца ўдача. І гэта здарылася. Пріорбанк, з якім супрацоўнічае Таццяна Родзіна, днямі адзначыў жанчыну як 150-тысячнага кліента з пенсійным рахункам. Падарункі і 10 мільёнаў рублёў ужо ў жанчыны, але пакуль што яна не ведае, як распарадзіцца імі. «Ведаеце, я вельмі люблю падарожжы. Хаця жыццё і не склалася так, каб шмат дзе пабываць. Нават у Беларусі мала што бачыла», — разважае жанчына. Можа быць, грошы стануць нагодай для невялікай вандроўкі. «Але я спачатку параюся з дзецьмі», — дадала Таццяна Мікалаеўна.

ПЕНСІЯНЕРЫ ЦЯПЕР ВЕЛЬМІ «ПРАСУНУТЫЯ»

«Асаблівую папулярнасць сярод кліентаў-пенсіянераў у нас сёння набірае карыстанне банкаўскімі паслугамі на аддаленым доступе — інтэрнэт-банкінг, SMS-банкінг, — распавядае Станіслаў Какановіч, начальнік аддзела арганізацыі продажаў Пріорбанка. — У Лідзе папулярным быў SMS-банкінг, калі аплаціць нешта можна было, адправіўшы паведамленне з мабільнага. Але апошнім часам інтэрнэт-банкінг стаў больш запатрабаваным. Акрамя таго, што за карыстанне гэтай паслугай яны атрымліваюць дадатковы працэнт на картку, мы ім прапануем пакет паслуг — страхаванне жыцця, авердрафт і іншае. Можна аформіць паслугу аўтаматычнага паўнення рахунку мабільнага тэлефона, напрыклад, раз на месяц».

А яшчэ часта пенсіянеры ездзяць да сваякоў за мяжу. «Таму ім вельмі важна, каб яны маглі выкарыстаць картку і там. Амаль усе тыя, у каго былі зарплатныя карткі ў нашым банку, застаюцца з намі і робяць пенсійныя карткі». Тым больш што пенсіянеры — гэта частка грамадства, якая вельмі кансерватыўная ў сваіх рашэннях: «Калі яны выбралі нейкі банк, то там, хутчэй за ўсё, і застануцца. Толькі калі ім нешта не падабаецца, могуць сысці. Асабліва гэта адчуваецца ў рэгіёнах».

Увогуле, банкаўскія спецыялісты канстатуюць, што за апошнія дзесяць гадоў станавіцца пенсіянерамі сталі не тыя бабулі і дзядулі, што раней. «Усе яны — «прасунутыя» карыстальнікі ўсяго сучаснага». Расказваюць нават, што ёсць адна бабулька гадоў 80, якая спецыяльна зрабіла картку, каб праз інтэрнэт-банкінг сачыць за сваімі транзакцыямі. Вельмі баялася, што хто-небудзь украдзе яе грошы.

***

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, фота аўтара,

г. *Ліда*

■

■ Выдавецкі дом «Звязда» прэзентуе

«Літаратура і мастацтва» — газета творчай інтэлігенцыі

Выдаецца з 1932 г. у Мінску на беларускай мове штотыднёва. Інфармуе пра надзённыя пытанні дзяржаўнай палітыкі ў галіне літаратуры, мастацтва і кнігавыдання, пра асноўныя кірункі дзейнасці Саюза пісьменнікаў Беларусі ў справе духоўнага фарміравання асобы і нацыі, захавання нацыянальнай культурнай спадчыны, пра стасункі з літаратарамі краін СНД, развіццё народнай творчасці і інш. На старонках газеты выступаюць пісьменнікі, літаратуразнаўцы, дзеячы мастацтва, кнігавыдаўцы, бібліятэкары, гісторыкі, краязнаўцы, выкладчыкі ВНУ, творчая моладзь.

Штотыднёвік публікуе агляды найбольш цікавых і папулярных выданняў, гутаркі з вядомымі творцамі, мастакамі-графікамі, рэйтынгі продажаў кніг у розных гарадах Беларусі, фотарэпартажы з кнігарняў краіны і замежжа.

	1 мес.	3 мес.	6 мес.
63856 для індывідуальных падпісчыкаў	28 500	85 500	171 000
63815 для настаўнікаў	18 000	54 000	108 000
63562 для ведамасных падпісчыкаў	76 400	229 200	458 400
63880 ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя	56 500	169 500	339 000

■ Вакол футбола

ХУТКАЕ РАЗВІТАННЕ «КАРАЛЁЎ»

FIFA WORLD CUP Brasil 2014

Паражэнне ад чылійцаў пазбавіла зборную Іспаніі шанцаў на выхад у плэй-оф

Апошнія дні Іспанія жыла футболам і падзеямі ў каралеўскім палацы. Здавалася б, якія розныя гісторыі!.. А вынік аднолькавы — каралі склалі паўнамоцтвы. І калі да палітычных пераўтварэнняў Іспанія была гатовая ўжо даўно, то правал любімай зборнай на мундзіялі для краіны стаў сапраўдным шокам.

Пасля паражэння ад галандцаў многія сталі ўспамінаць, што «чырвоная фурыя» і на папярэднім чэмпіянаце свету пачала з паражэння. Але затым пяць перамог запар — і Кубак свету паехаў у Мадрыд. Праўда, яшчэ і чатыры гады таму знаходзіліся скептыкі, якія казалі пра хуткае заканчэнне іспанскай гегемоніі ў футболе. Маўляў, 7 галоў за турнір — неверагодна мала для каманды такога узроўню. Надзейную абарону тады ўспрымалі як належнае. Дарэмна...

Чылійцам, як і галандцам, экс-чэмпіёны свету прайгралі найгрубейшымі памылкамі ў сваёй зоне. Замены, якія зрабіў **галоўны трэнер зборнай Іспаніі Вісэнтэ Дэль Боске** пасля першага матча, выглядалі непераканаўчымі. Не дапамаглі сваёй камандзе ні Хаві Марцінес, які замяніў Жэрара Піке, ні вопытны Серхіа Рамас... А той факт, што Фернанда Торэс, які з'явіўся на полі толькі ў канцы сустрэчы і быў, напэўна, адзіным, хто мог забіць у вароты чылійцаў, яшчэ раз даказвае тактычны пралік Дэль Боске. Зрэшты, сам трэнер пасля гульні прызнаў, што каманду падкасіў непрыемны пройгрыш у першым матчы: «Другі тайм з Галандыяй, які мы цалкам правалілі, стаў занадта цяжкім грузам. Гэта быў шок, бо мы добра падрыхтаваліся да турніру, шмат трэніраваліся і набралі нядрэнную форму. Хацелі рэабілітавацца ў гульні супраць чылійцаў, але згуляць лепш, чым сапернік, не атрымалася. Мы шмат атакавалі,

Нічога іншага, як хапацца за галаву, іспанскім футбалістам не заставалася.

але не змаглі рэалізаваць свае моманты. Аднак апраўданняў у нас няма».

Не шукае апраўданняў зборнай і іспанская прэса. Вядучыя выданні краіны стракацяць жалобнымі загалоўкамі — «Могілкі каралёў», «Забойства на полі», «Усеагульная катастрофа»... Журналісты абвінавачваюць Дэль Боске, праводзяць паралелі з застоем «Барселоны» і разважаюць пра заняпад іспанскага футбола. Здаецца, зразумець прычыны паражэння здольныя ўсе, а вось хто ведае, што рабіць далей?

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

Дзейныя чэмпіёны свету не ўпершыню выбываюць з гульні на групавой стадыі:

1966 год. Бразільцы трапілі ў няпростую групу, сапернікамі паўднёваамерыканскай каманды сталі балгары, венгры, якія яшчэ не страцілі да канца былую сілу, і партугальцы з Эйсебіа. У першым матчы Бразілія перайграла Балгарыю, Пеле вызначыўся голам. Аднак лідар бразільцаў атрымаў траўму і на наступны матч з венграмі не выйшаў. Зборная Бразіліі саступіла 1:3. Праз боль Пеле выйшаў на поле ў матчы з Партугаліяй. Партугальцы ведалі, што кароль футбола гуляе з пашкоджаннем, і жорстка білі Пеле па нагах. Матч Пеле скончыў увесь у бінтах, але дапамагчы сваёй камандзе так і не змог — 1:3, і Бразілія адправілася дадому.

2002 год. За год да мундзіяля **французы** выйгралі Кубак канфедэрацый. У Карэю і Японію «гальскія пеўні» ехалі фаварытамі. Але ўжо ў першым матчы супраць Сенегала выявіліся праблемы каманды — шмат індывідуальных памылак і адсутнасць лідара Зінедзіна Зідана. Пасля нічыёй з Уругваем у французаў заставаліся шанцы на праход далей, тым больш што зборная Даніі не ўяўляла сур'ёзнай пагрозы. Зідан выйшаў на поле, але на вынік матча гэта не паўплывала. Французы саступілі 0:2 і скончылі выступленні на чэмпіянаце на апошнім месцы ў групе.

2010 год. Аб'ектыўныя прычыны правалу **італьянцаў** усё ж такі былі: каманда трапіла ў складаную эпоху змены пакаленняў. Дастаткова сказаць, што ў параўнанні з фінальным матчам чэмпіянату свету 2006 года ў складзе зборнай Італіі ў першым матчы адбылося адразу восем замен (засталіся толькі Буфон, Дзамброта і 37-гадовы Канавара). Аднак і да гэтага часу складана зразумець, як можна было не выйсці з групы Новая Зеландыя — Славенія — Парагвай.

■ Факт

ГАЛЕРЭЯ НА КОЛАХ

У Магілёве пачаў курсіраваць незвычайны тралейбус, дзе пасажыры могуць азнаёміцца з мастацкімі творамі.

Перасоўная выстава запрацавала ў рамках праекта «Мастацтва на палях», які з'яўляецца часткай агульнагарадской акцыі «Нашы 70 добрых спраў», прымеркаванай да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На бартах і ў салоне тралейбуса №114, які курсіруе па самых шматлюдных маршрутах №№ 2 і 4, размясцілі каля 30 рэпрадукцый карцін вядомага магілёўскага мастака Базыля Камарова, які сёлета святкуе сваё 60-годдзе.

— З прапановай падтрымаць сацыяльную рэкламу да нас звярнуўся Цэнтр гарадскіх ініцыятыў, — адзначыў **намеснік дырэктара прадпрыемства «Гарэлектратранспарт» Віталь МАРДЗЯЛЁЎ.** — Прыемна адчуваць дачыненне да айчыннага мастацтва і займацца асветніцкай справай. Нават нашы работнікі, якія працуюць на «рэкламным» тралейбусе, прызнаюцца — для іх гэта вельмі ганарова.

Пасажыры, калі бачаць незвычайны тралейбус, пачынаюць усміхацца, фатаграфаваць. Некаторыя і наогул мяняюць свой маршрут і садзяцца на маляўнічы тралейбус, каб паглядзець усю выставу. Не кожны ж дзень выпадае магчымасць усяго за 3200 рублёў — кошт праязнога квітка — далучыцца да мастацтва.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Даты Падзеі Людзі

1566 год — нарадзіўся Жыгімонт III Ваза, вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага, кароль Польшчы (1587-1632) і Швецыі (1592-1599). Абраны на трон Польшчы і ВКЛ пасля смерці Стэфана Баторыя. Каб замацаваць свае пазіцыі сярод беларуска-літоўскіх магнатаў і шляхты, выдаў у 1588 годзе ў Кракаве прывілей, які зацвярджаў Статут ВКЛ 1588 года.

1939 год — нарадзіўся Валерый Мікалаевіч Раеўскі, беларускі рэжысёр, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1976), народны артыст Беларусі (1995). У 1967 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. З 1968 года працаваў у Нацыянальным акадэмічным тэатры ім. Я. Купалы (з 1973-га — галоўны рэжысёр, з 1991-га — мастацкі кіраўнік, з 2009-га — рэжысёр). Адначасова выкладаў у Беларускай акадэміі мастацтваў (з 1996-га прафесар). Сярод пастановак: «Пагарэльцы», «Святая прастата» А. Макаёнка, «Рэвізор» М. Гогаля, «Тры сястры» А. Чэхава, «Радавыя» і «Парог» А. Дударава і інш. На беларускім тэлебачанні паставіў спектакль «За шчасцем, за сонцам» па Я. Купалу, фільм-спектакль «Апошні шанц» па В. Быкаву. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1985), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988). Памёр у 2011 годзе.

1945 год — Сцяг Перамогі, які стаў сімвалам перамогі савецкіх войскаў над нямецка-фашысцкімі захопнікамі, з адмысловымі воінскімі ўшанаваннямі спецыяльным рэйсам на самалёце быў дастаўлены з Берліна ў Маскву.

Было сказана

Рыгор БАРАДУЛІН, народны паэт Беларусі:

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці.

НАРОДЖАНЫЯ 20 чэрвеня

Гэтыя людзі надзелены здольнасцю выклікаць розныя эмоцыі ў навакольных. Яны знаходзяць захапленне ў тым, каб пераконваць іншых, але ім не хапае цярплівасці да супрацьлеглых думак. Псіхааналітычныя здольнасці, яснабачанне, празарлівасць — якасці, уласцівыя людзям гэтага дня. Для іх важна развіваць у сабе дабрыню, цярплівасць, спагадлівасць. Ім неабходна навучыцца выказваць свае эмоцыі проста, натуральна, імкнуцца да ўнутранага і знешняга спакою.

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ на 31 декабря 2013 года

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 31 декабря 2013 года)

	2013 г.	2012 г.
АКТИВЫ		
Денежные средства и их эквиваленты	1 866 315	2 704 286
Драгоценные металлы	12 547	11 100
Производные финансовые активы	38	240
Средства в кредитных организациях	749 103	769 622
Кредиты клиентам	13 760 636	12 566 013
Инвестиционные ценные бумаги, имеющиеся в наличии для продажи	1 917 147	1 412 877
Инвестиции в ассоциированную компанию	34 203	31 613
Основные средства	883 102	667 190
Активы, построенныедля продажи	190 430	281 585
Инвестиционная недвижимость	10 592	-
Нематериальные активы	145 452	99 471
Текущий актив по налогу на прибыль	60 964	13 366
Отложенные активы по налогу на прибыль	11 222	27 358
Прочие активы	244 283	205 420
Итого активы	**19 886 034**	**18 790 141**
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА		
Средства кредитных организаций	9 205 226	8 507 498
Задолженность перед Национальным банком Республики Беларусь	250 077	87
Производные финансовые обязательства	32	31 820
Средства клиентов	6 307 352	6 032 377
Выпущенные долговые ценные бумаги	18 225	387 171
Текущие обязательства по налогу на прибыль	90 475	78 288
Отложенные обязательства по налогу на прибыль	8 102	20 448
Прочие обязательства	211 312	185 141
Субординированный кредит	792 870	838 477
Итого обязательства	**16 883 671**	**16 081 307**
КАПИТАЛ		
Уставный капитал	4 070 366	4 070 366
Эмиссионный доход	3 940	3 940
Дополнительный капитал	47 198	47 198
Фонд переоценки зданий	159 352	-
Нереализованная переоценка инвестиционных ценных бумаг, имеющихся в наличии для продажи	3 190	18 939
Накопленный дефицит	(1 356 167)	(1 503 479)
Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка	2 927 879	2 636 964
Неконтрольные доли участия	74 484	71 870
Итого капитал	**3 002 363**	**2 708 834**
Итого капитал и обязательства	**19 886 034**	**18 790 141**

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ независимого аудитора по обобщенной консолидированной финансовой отчетности ОАО «Банк БелВЭБ» и его дочерних компаний за период с 1 января по 31 декабря 2013 года

Председателю Правления
ОАО «Банк БелВЭБ» Г-ну Каллауру П.В.

Акционерам и Наблюдательному совету ОАО «Банк БелВЭБ»

Прилагаемая обобщенная консолидированная финансовая отчетность, которая включает в себя обобщенный консолидированный отчет о финансовом положении, обобщенный консолидированный отчет о прибылях и убытках, обобщенный консолидированный отчет о совокупном доходе, обобщенный консолидированный отчет об изменениях в капитале и обобщенный консолидированный отчет о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, была подготовлена на основании аудированной консолидированной финансовой отчетности открытого акционерного общества «Белвнешэкономбанк» (ОАО «Банк БелВЭБ») и его дочерних компаний (далее по тексту – «Банк») по состоянию на 31 декабря 2013 г., и за год, закончившийся на указанную дату. В заключении независимых аудиторов, датированным 20 марта 2014 г., мы выразили безусловно положительное мнение о данной финансовой отчетности Банка.

Обобщенная консолидированная финансовая отчетность не содержит всех раскрытий, требуемых Международными Стандартами Финансовой Отчетности, применяемых для подготовки полного комплекта аудированной консолидированной финансовой отчетности Банка. Обобщенная консолидированная финансовая отчетность, таким образом, не является заменой полного комплекта аудированной консолидированной финансовой отчетности Банка.

Ответственность руководства в отношении обобщенной консолидированной финансовой отчетности

Руководство Банка несет ответственность за подготовку обобщенной консолидированной финансовой отчетности в соответствии с информацией, содержашейся в полном комплекте аудированной консолидированной финансовой отчетности Банка.

Ответственность аудитора

Наша ответственность заключается в выражении мнения о достоверности обобщенной консолидированной финансовой отчетности на основе проведенного нами аудита, который был проведен в соответствии с Международным стандартом аудита (МСА) 810 «Задания о составлении отчета по обобщенной финансовой отчетности».

Мнение

По нашему мнению, обобщенная консолидированная финансовая отчетность, подготовленная на основании аудированной консолидированной финансовой отчетности Банка по состоянию на 31 декабря 2013 г. и за год, закончившийся на указанную дату, во всех существенных аспектах соответствует данной аудированной консолидированной финансовой отчетности.

20 марта 2014 года

Сведения об аудируемом лице
Наименование: Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк» (ОАО «Банк БелВЭБ»)
Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 12 декабря 1991 года, регистрационный № 24.
Местонахождение: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т. Победителей, 29
Сведения об аудиторе
Наименование: Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Эрнст энд Янг»
Свидетельство о государственной регистрации № 577, выданное Минским городским исполнительным комитетом 7 апреля 2005 года.
Местонахождение: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Короля, 51, 2-ой этаж, офис 30.

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за год, закончившийся 31 декабря 2013 года

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 31 декабря 2013 года)

	2013 г.	2012 г.
Процентные доходы		
Кредиты клиентам	1 986 139	1 708 822
Инвестиционные ценные бумаги	123 305	177 674
Средства в кредитных организациях	82 707	73 810
Финансовая аренда	15 527	19 790
	2 207 678	**1 980 096**
Процентные расходы		
Средства кредитных организаций	(517 268)	(392 660)
Средства клиентов	(490 172)	(489 126)
Прочие заемные средства	-	(45 989)
Субординированный кредит	(45 830)	(34 666)
Выпущенные долговые ценные бумаги	(87 848)	(104 879)
	(1 141 118)	**(1 067 320)**
Чистый процентный доход	**1 066 560**	**912 776**
Резерв под обесценение кредитов	(162 239)	(98 421)
Эффект первоначального признания активов, по которым начисляются проценты	(30 811)	(26 041)
Чистый процентный доход после резерва под обесценение кредитов	**873 510**	**788 314**
Чистые комиссионные доходы	314 933	238 530
Чистые доходы по операциям с инвестиционными ценными бумагами, имеющимися в наличии для продажи	26 859	250
Чистые доходы /(расходы) по операциям в иностранной валюте:		
- торговые операции	97 814	(85 751)
- переоценка валютных статей	(13 860)	218 504
Доля в прибыли ассоциированной компании	3 210	7 730
Финансовый результат от выбытия дочерних компаний	-	68
Прочие доходы	246 603	508 805
Непроцентные доходы	**675 559**	**888 136**
Расходы на персонал	(438 144)	(414 793)
Амортизация	(58 363)	(48 404)
Налоги кроме налога на прибыль	(17 983)	(15 590)
Прочие расходы от обесценения и создания резервов	(2 471)	-
Прочие операционные расходы	(489 819)	(589 405)
Непроцентные расходы	**(1 006 780)**	**(1 068 192)**
Прибыль до расходов по налогу на прибыль и убытка по чистой денежной позиции	**542 289**	**608 258**
Убыток по чистой денежной позиции в связи с гиперинфляцией	**(257 655)**	**(230 748)**
Прибыль до расходов по налогу на прибыль и послеубытка по чистой денежной позиции	**284 634**	**377 510**
Расходы по налогу на прибыль	(110 556)	(110 943)
Прибыль за год	**174 078**	**266 567**
Приходящаяся на:		
- акционеров Банка	147 312	240 184
- неконтрольные доли участия	26 766	26 383
	174 078	**266 567**
Прибыль за год	**174 078**	**266 567**
Прочий совокупный доход/(расход)		
Прочий совокупный доход, подлежащий переклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах:		
Нереализованные доходы по операциям с инвестиционными ценными бумагами, имеющимися в наличии для продажи	11 110	19 533
Реализованные доходыо операциям с инвестиционными ценными бумагами, имеющимися в наличии для продажи, переклассифицированные в отчет о прибылях и убытках	(26 859)	(250)
Чистый прочий совокупный доход, подлежащий переклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах	**(15 749)**	**19 283**
Прочий совокупный доход, не подлежащий переклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах:		
Переоценка зданий	162 314	-
Налог на прибыль	(2 962)	-
Чистый прочий совокупный доход, не подлежащий переклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах	**159 352**	**-**
Прочий совокупный доход за год, за вычетом налогов	**143 603**	**19 283**
Итого совокупный доход за год	**317 681**	**285 850**
Приходящийся на:		
- акционеров Банка	290 915	259 467
- неконтрольные доли участия	26 766	26 383
	317 681	**285 850**

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за год, закончившийся 31 декабря 2013 года

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 31 декабря 2013 года)

	2013 г.	2012 г.
Прибыль за год до убытка по чистой денежной позиции	**431 733**	**497 315**
Корректировки:		
Амортизация	58 363	48 404
Изменение отложенного и начисленного текущего налога на прибыль	(26 382)	82 232
Создание резервов под обесценение и прочих резервов	164 710	98 421
Изменение справедливой стоимости производных финансовых инструментов	(32 312)	2 411 018
Доля в прибыли ассоциированной компании	(3 210)	(7 730)
Убыток от продажи дочерних компаний	-	(68)
Переоценка валютных статей	13 860	(218 504)
Эффект первоначального признания активов, по которым начисляются проценты	30 811	26 041
Изменения в начисленных процентных доходах и расходах	(33 713)	(24 673)
Убыток от переоценки основных средств	68 231	-
(Убыток)/доход от выбытия основных средств и нематериальных активов	(6 295)	3 636
Прочие изменения	1 970	2 712
Денежные потоки от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах	**667 766**	**2 918 804**
Чистое (увеличение)/уменьшение операционных активов:		
Драгоценные металлы	(3 016)	(2 227)
Средства в кредитных организациях	(21 101)	(580 609)
Кредиты клиентам	(1 980 105)	(5 763 129)
Активы, построенные для продажи	91 155	10 398
Прочие активы	(45 272)	(57 513)
Чистое увеличение/(уменьшение) операционных обязательств:		
Краткосрочные средства кредитных организаций	720 642	1 662 431
Средства клиентов	614 006	1 767 081
Прочие обязательства	23 929	(9 857)
Чистые денежные потоки от операционной деятельности	**68 004**	**(54 621)**
Денежные потоки от инвестиционной деятельности		
Продажа, погашение инвестиционных ценных бумаг	1 172 210	6 770 364
Приобретение инвестиционных ценных бумаг	(1 734 839)	(8 238 808)
Полученные дивиденды	620	1 276
Приобретение основных средств и нематериальных активов	(243 183)	(244 195)
Поступления от реализации основных средств и нематериальных активов	10 715	39 388
Поступления от выбытия доли участия в дочерних компаниях за вычетом денежных средств выбывших дочерних компаний	-	14 558
Чистое расходование денежных средств в инвестиционной деятельности	**(794 477)**	**(1 657 417)**
Денежные потоки от финансовой деятельности		
Увеличение уставного капитала	-	573 690
Поступления от долгосрочных банковских кредитов	1 132 521	1 229 377
Погашение долгосрочных банковских кредитов	(653 027)	(394 246)
Поступления от выпуска долговых ценных бумаг	147 070	577 222
Погашение долговых ценных бумаг	(470 673)	(282 079)
Дивиденды, выплаченные дочерними компаниями	(24 152)	(21 714)
Чистое поступление денежных средств от финансовой деятельности	**131 739**	**1 682 250**
Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты	156 641	215 995
Эффект влияния гиперинфляции на денежные средства и их эквиваленты	(399 878)	(552 633)
Чистое уменьшение денежных средств и их эквивалентов	**(837 971)**	**(366 426)**
Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного года	**2 704 286**	**3 070 712**
Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного года	**1 866 315**	**2 704 286**
Дополнительная информация:		
Налог на прибыль уплаченный	(136 938)	(28 711)
Проценты уплаченные	(1 125 794)	(1 053 882)
Проценты полученные	2 156 480	1 941 986

Подписано и утверждено к выпуску от имени Правления Банка

Каллаур Павел Владимирович — Председатель Правления
Филиппова Людмила Алексеевна — Главный бухгалтер
12 марта 2014 г.

Годовая финансовая отчетность в полном объеме вместе с аудиторским заключением, подтверждающим ее достоверность, размещена на сайте www.belveb.by
в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Годовая финансовая отчетность /Годовая финансовая отчетность по МСФО за 2013».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 №6. УНП 100010078.

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В КАПИТАЛЕ за год, закончившийся 31 декабря 2013 года

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 31 декабря 2013 года)

	Приходится на акционеров Банка								
	Уставный капитал	Эмиссионный доход	Дополнительный капитал	Фонд переоценки зданий	Нереализованная переоценка инвестиционных ценных бумаг, имеющихся в наличии для продажи	Накопленный дефицит	Итого капитал	Неконтрольные доли участия	Итого капитал
На 31 декабря 2011 г.	**3 496 676**	**3 940**	**47 198**	**-**	**(344)**	**(1 743 663)**	**1 803 807**	**82 113**	**1 885 920**
Прибыль за год						240 184	240 184	26 383	266 567
Прочий совокупный доход за год				-	19 283		19 283		19 283
Итого совокупный доход за год				-	19 283	240 184	259 467	26 383	285 850
Увеличение уставного капитала (Примечание 25)	573 690						573 690		573 690
Дивиденды, выплаченные дочерними компаниями								(21 714)	(21 714)
Выбытие дочерних компаний (Примечание 5)								(14 912)	(14 912)
На 31 декабря 2012 г.	**4 070 366**	**3 940**	**47 198**	**-**	**18 939**	**(1 503 479)**	**2 636 964**	**71 870**	**2 708 834**
Прибыль за год						147 312	147 312	26 766	174 078
Прочий совокупный доход/(расход) за год				159 352	(15 749)		143 603		143 603
Итого совокупный доход/(расход) за год				159 352	(15 749)	147 312	290 915	26 766	317 681
Дивиденды, выплаченные дочерними компаниями								(24 152)	(24 152)
На 31 декабря 2013 г.	**4 070 366**	**3 940**	**47 198**	**159 352**	**3 190**	**(1 356 167)**	**2 927 879**	**74 484**	**3 002 363**

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.37	21.45	17.08
Віцебск	4.18	21.43	17.25
Магілёў	4.27	21.36	17.09
Гомель	4.33	21.22	16.49
Гродна	4.54	21.59	17.05
Брэст	5.04	21.50	16.46

Месяц

Апошняя квадра 19 чэрвеня. Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Валеры, Зінаіды, Марыі, Багдана, Фядота.*
К. *Бянігны, Фларэнціны, Багдана, Міхала, Рафала.*

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+16..+18°С	КІЕЎ	+20..+22°С	РЫГА	+14..+16°С
ВІЛЬНЮС	+14..+16°С	МАСКВА	+21..+23°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+12..+14°С

УСМІХНЕМСЯ

Лепшы спосаб давесці жанчыну да нервовага зрыву — проста маўчаць, калі яна спрабуе нешта даказаць.

Муж прыходзіць п'яны дадому. Жонка пачынае, як звычайна:
— Ты п'яная свіння...
— Ціха, жанчына! У мяне сёння свята!
— Якое?
— Дзень грамадзянскай авіяцыі!
— Пры чым тут ты? Ты ж сантэхнік!
— А хто толькі што на аўтапілоце прыйшоў?

Люся памяняла ўсе нумары тэлефонаў, змяніла адрас, прозвішча, колер валасоў... Зрабіла ўсё, каб ён не змог больш яе знайсці. А ён і не збіраўся яе шукаць!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для сваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.906. Індэкс 63850. Зак. № 2482.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 19 чэрвеня 2014 года.